№№142–143
(2453–2454)

8 верасня 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

ЗВАРОТ

Прэс-служба Аляксандра Мілінкевіча распаўсюдзіла яго зварот да беларускага народа з нагоды маючага адбыцца рэферэндуму.

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ

Маці-Радзіма патрабуе нашай абароны, чыстай веры, шчырай любові і гарачых сэрцаў!

Дарагія суайчыннікі!

Прыйшоў час, калі ад кожнага з нас залежыць наша будучыня. У найбліжэйшыя месяцы нам прыйдзецца вырашыць, ці будзе далей існаваць наша Радзіма — родная Беларусь, ці мы станем ускраінай іншай краіны-суседкі Расіі.

Цяперашні кіраўнік Беларусі доўга гуляў у інтэграцыю, бо надзвычай хацеў стаць самадзержцам "усяе Русі". І дагуляўся. Плануецца рэферэндум па стварэнні так званай Саюзнай дзяржавы. Гэта не будзе аб'яднанне роўных. Наш лёс стане вырашаць "саюзнае" кіраўніцтва, дзе ў нас будзе нашмат менш галасоў, чым у суседзяў. Зноў па дазвол на ўсё будзем ехаць на паклон у сталіцу Расіі.

З суседам трэба сябраваць, супрацоўнічаць, гандляваць, паважаць адзін аднаго. Але нашто зноў рабіць камунальную кватэру, спрабаваць жыць не сваім, а чужым розумам? Чаму мы, працавіты, адукаваны народ, павінны перакласці адказнасць за наш лёс на іншых? Мы што — нямоглыя, хворыя, неразумныя?

Нам кажуць: "Мы заўсёды былі разам..." Няпраўда — толькі два няпоўныя стагоддзі. А беларускай дзяржаўнасці больш за тысячу гадоў. Або лямантуюць: "Мы такія бедныя, а ў іх — нафта і газ". Але толькі непісьменны чалавек не ведае, што хутка ўсюды цэны на энерганосьбіты будуць сусветныя.

Паглядзіце на сённяшні свет: багацей за ўсё жывуць людзі ў невялікіх краінах, дзе не шмат прыродных рэсурсаў. Бо жывуць па сваёй волі ў свабодзе для сябе, а не для іншаземнага дзядзькі.

Затое скажу я табе, мой народзе: аб'яднаемся — і нашы дзеці будуць ваяваць у Чэчні, і скупяць нашы прадпрыемствы і зямлю іхнія алігархі, і прыйдуць да нас іхнія мафія і злачынцы, і станем мы глыбінкай Расіі, дзе жывуць куды бядней, чым сёння ў нас.

Думайце, разважайце. Нават родным братам лепей жывецца ва ўласных дамах, чым у інтэрнаце.

Мы павінны захаваць нашу Беларусь незалежнай. Святым не гандлююць. Бацькаўшчына дасталася нам ад продкаў, і мы мусім захаваць яе для нашых нашчадкаў. Толькі незалежная Беларусь можа забяспечыць сваім грамадзянам дабрабыт і спакой.

Мы пабудуем еўрапейскую Беларусь, якая будзе для нас утульным домам, а для нашых суседзяў надзейным мостам супрацоўніцтва, але ніколі — прахадным двором або разменнай манетай.

Маці-Радзіма патрабуе нашай абароны, чыстай веры, шчырай любові і гарачых сэрцаў.

Толькі разам мы адстаім свабоду і незалежнасць. Кожны з Вас патрэбен для гэтай святой справы.

Мы пераможам!

З ГІСТОРЫІ ПЫТАННЯ

Аб правядзенні рэферэндуму па стварэнні саюзнай дзяржавы загаварылі адразу пасля вяртання А.Лукашэнкі з Сочы. Інфармацыю пра гэта агучыла прэс-служба дзяржсакратара саюзнай дзяржавы. У адпаведным інфармацыйным паведамленні было сказана, што аб даце правядзення саюзнага рэферэндуму можа быць аб'яўлена ўжо ў верасні. Прэс-сакратар дзяржсакратара **Паўла Барадзіна Іван Макушок** зрабіў заяву: *"Паколькі галоўны дакумент саюзнай дзяржавы ўжо звярстаны і не выклікае пытанняў, усе працоўныя моманты ўпарадкаваны, нарэшце прыступілі да абмеркавання даты рэферэндуму па стварэнні новага суб'екта".*

Сам Барадзін сказаў журналістам наступнае: *"Рэальна мы зможам правесці рэферэндум восенню 2006 года, а выбары ў будучы парламент — альбо восенню гэтага года, альбо вясной наступнага".*

Пакуль дата правядзення рэферэндуму не агучана.

Палітолаг **Андрэй Суздальцаў**, які быў нядаўна дэпартаваны з Беларусі ў Расію, каментыруючы інфармацыю пра магчымы рэферэндум, сказаў: *"Я не давяраю паведамленням прэс-службы Барадзіна, таму што такая інфармацыя павінна сыходзіць як мінімум ад прэс-служб кіраўнікоў дзяржаў".*

Прэс-служба А.Лукашэнкі пакуль маўчыць... Але закон аб выбарах у саюзны парламент ужо прайшоў першае чытанне ў Палаце прадстаўнікоў. Адзін за адным агучваюць сваю падтрымку маючаму адбыцца рэферэндуму і беларускія чыноўнікі.

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Дзе Ганчар? Дзе Красоўскі?..

Ліст з такімі пытаннямі ў апошні дзень жніўня Аб'яднаная грамадзянская партыя дасла на імя А.Лукашэнкі.

АГП патрабуе, каб 16 верасня А.Лукашэнка праз сродкі масавай інфармацыі праінфармаваў грамадскасць аб выніках расследавання гвалтоўных знікненняў **Віктара Ганчара, Юрыя Захаранкі, Анатоля Красоўскага** і **Дзмітрыя Завадскага.**

"Настаў час альбо чэсна сказаць, што здарылася сем гадоў таму з лідэрамі палітычнай апазіцыі, а таксама іх калегамі, альбо прызнаць сваю бездапаможнасць і незацікаўленасць у раскрыцці гэтых злачынстваў", — гаворыцца ў звароце.

"Пры той колькасці матэрыялаў і дакументаў, якія былі надрукаваныя ў сродках масавай інфармацыі, а таксама дастатковай наяўнасці сведкаў рабіць выгляд глуханямога сляпца — значыць публічна пацвярджаць сваю датычнасць да палітычных забойстваў", — гаворыць старшыня АГП **Анатоль Лябедзька.**

— Я разумею, што хутчэй за ўсё наш ліст пакінуць без адказу, — сказаў Анатоль Уладзіміравіч у інтэрв'ю "Народнай волі". — У мяне ёсць такі сумны вопыт супрацоўніцтва з Аляксандрам Рыгоравічам, калі той нават публічна абяцаў нешта зрабіць, але не трымаў слова. У прыватнасці, гэта датычыцца дзейнасці вядомага фонду **Махмуда Эсамбаева**. Лукашэнка на сесіі парламента прылюдна паабяцаў, што прадставіць матэрыялы наконт дзейнасці гэтага фонду ў Беларусі, але... Таму мы не цешым сябе ілюзіяй, што атрымаем адказ ад самога Лукашэнкі ці ад кагосьці з высокапастаўленых чыноўнікаў наконт гвалтоўнага знікнення **Віктара Ганчара** і **Анатоля Красоўскага.** Аднак 16 верасня — гэта нагода яшчэ раз нагадаць аб тым, што здарылася. Нагадаць аб тым, што ёсць такая праблема. Я лічу, што калі пастаянна біць у званы, то іх голас нарэшце пачуюць...

— У дзень знікнення Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадскага людзі традыцыйна прыходзілі на Кастрычніцкую плошчу...

— Не будзе выключэння і на гэты раз. Наша месца ў гэты дзень на плошчы, бо мы памятаем...

— Скажыце, Аб'яднаная грамадзянская партыя ўласнымі сіламі праводзіць пошук дадатковай інфармацыі па гэтых справах?

— Я лічу, што матэрыялаў і доказаў ужо дастаткова для таго, каб пачынаць судовы працэс. Калі не ў Беларусі, то ў Еўропе.

— Пра міжнародны судовы працэс кажуць ужо не першы год. Наколькі, па-Вашаму, вялікая верагоднасць таго, што ён адбудзецца?

— Міжнародны грамадскі суд абавязкова адбудзецца. І адно з галоўных пытанняў, якое будзе разглядацца падчас працэсу, — гэта гвалтоўныя знікненні і палітычныя забойствы апанентаў беларускага рэжыму. Я не маю ніякіх сумненняў на гэты конт. Беларускаму юрыдычнаму суду застанецца толькі падтрымаць прысуд. Я не веру ў тое, што беларуская ўлада не датычная да знікненняў гэтых людзей. Калі за сем год яна не знайшла злачынцаў, не расследавала належным чынам гэтыя знікненні, значыць, яна сама мае да іх дачыненне...

Марына КОКТЫШ.

З АРХІВА «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі **Віктар Ганчар** і бізнесмен **Анатоль Красоўскі** не вярнуліся дадому 16 верасня 1999 года. Яны разам вярталіся з лазні па вуліцы Фабрычнай. Пазней недалёка ад месца іх гвалтоўнага знікнення былі знойдзены асколкі шкла джыпа "Чэроки", які належаў Красоўскаму.

З матэрыялаў крымінальнай справы №110351:

"Пры аглядзе месца здарэння — тэрыторыі, прылягаючай да будынка лазні па вул.Фабрычнай, 20а, — на асфальтавым пакрыцці дарогі, якая вядзе ад лазні на вул. Фабрычную, былі знойдзены асколкі шкла белага і жоўтага колеру, восып празрыстага шкла і бурыя плямы, падобныя на кроў. Знойдзены таксама сляды тармажэння аўтамашыны і след яе ўдару аб дрэва, з якога ўзяты ўзоры фарбы чырвонага колеру".

Як паказала экспертыза, шкло і фарба сапраўды належаць машыне Красоўскага. А *"бурыя плямы, падобныя на кроў"*, — па заключэнні экспертаў — кроў чалавека групы 0 (1). Геномная экспертыза з верагоднасцю 99,9998% устанавіла, што кроў належыць **Віктару Ганчару.**

У сродках масавай інфармацыі паведамлялі, што знайшоўся сведка, які ў дзень знікнення Ганчара і Красоўскага каля лазні бачыў чырвоную БМВ, у якой сядзелі тры чалавекі. А жанчына, якая працавала ў лазні, узгадала, што чула крыкі аб дапамозе, шум, мужчынскія галасы...

З заключэння следчай групы:

"З вялікай верагоднасцю можна зрабіць вывад аб тым, што аўтамашына Красоўскага А.С. была спынена пры выездзе з лазні. Пасля чаго А.Красоўскі і В.Ганчар насільна былі скрадзены нявысветленымі асобамі і звезены ў невядомым накірунку. Аднак у ходзе следства не высветлены далейшы лёс Ганчара, Красоўскага, а таксама асоб, якія іх скралі".

З рапарта былога кіраўніка Галоўнага ўпраўлення Крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі генерала Мікалая Лапаціка:

"Акцыя захопу і далейшага знішчэння Захаранкі ажыццяўлялася групай ваеннаслужачага спецназа на чале з Паўлічэнкам (камандзір ваеннай часці 3214). Па аналагічнай камбінацыі 16.09.1999 года Паўлічэнка і яго група правялі акцыю захопу і знішчэння В.Ганчара і А.Красоўскага. Мяркуемае месца пахавання трупаў — спецучастак на Паўночных могілках".

Як сцвярджае былы кіраўнік СІЗА №1 **Алег Алкаеў**, Ганчар, Красоўскі і Захаранка былі забіты з так званага расстрэльнага пісталета, які выдаваўся па загадзе былога міністра ўнутраных спраў Ю.Сівакова.

З даклада спецдакладчыка Хрыстаса Пургурыдэса:

"Расстрэльны пісталет, які захоўваўся ў спадара Алкаева, які ажыццяўляў у Беларусі смяротныя пакаранні, двойчы выдаваўся ў перыяды, якія супадаюць са знікненнямі Захаранкі 7 мая 1999 года, Ганчара і Красоўскага 16 верасня 1999 года.

Улады не могуць прадставіць альтэрнатыўнага тлумачэння часовых канфіскацый пісталета".

С глазу на глаз

В Верховном суде Беларуси близится к завершению процесс по уголовному делу экс-руководителей ОАО "Нафтан".

Расследование уголовного дела руководителей ОАО "Нафтан" вел Комитет государственной безопасности. Все материалы с самого начала были засекречены. КГБ ограничивался лишь обозначением статей Уголовного кодекса, которые инкриминировались людям, еще недавно считавшимся элитой белорусского бизнеса.

Бывшие коммерческий директор Дмитрий Бондарчук, и.о. коммерческого директора Сергей Мартынов обвиняются в хищении путем злоупотребления служебными полномочиями в особо крупном размере, генеральный директор Константин Чесновицкий — в злоупотреблении служебными полномочиями, повлекшем тяжкие последствия.

Генеральный прокурор Петр Миклашевич обмолвился, что размер ущерба, нанесенного ОАО "Нафтан" со стороны его руководителей, составил 3,743 млн. долларов. Он также сообщил, что К.Чесновицкий на стадии следствия возвратил 1,25 млн. долларов для того, чтобы иметь основания для обращения к президенту с просьбой о помиловании.

К.Чесновицкого не помиловали, по крайней мере, пока, так как нет субъекта помилования.

Сергей САЦУК.
ej.by

Вучоба і стажыроўка ў Чэшскай Рэспубліцы

Чэшскія вышэйшыя навучальныя ўстановы прапануюць ужо ў гэтым годзе студэнтам і іншым зацікаўленым работнікам недзяржаўных арганізацый камандзіроўкі і кароткатэрміновыя стажыроўкі і курсы ў Чэшскай Рэспубліцы. Гэтыя праекты фінансуюцца ўрадам Чэшскай Рэспублікі.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць па тэл.: **+375 29-620-34-87, + 375 29-328-59-92.**

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

Крэмль чакае ля расчыненай пасткі

Аляксандр КЛАСКОЎСКІ,
спецыяльна для «Народнай волі»

Апазіцыя педалюе версію пра хуткую здачу суверэнітэту на рэферэндуме, згоду на які беларускія ўлады могуць даць пад ціскам Крамля. Разам з тым шэраг экспертаў прарочаць новую газавую вайну. Яны лічаць, што на мінулым тыдні ў Пінску прагучалі папераджальныя залпы.

У "сталіцы Палесся" беларускі афіцыйны кіраўнік парушыў маўчанне наконт газу. Хоць і не хацелася дражніць маскоўскіх гусей, але далей трываць, мусіць, не выпадае.

Магчыма, чашу цярпення перапоўніў нядаўні "зліў" у маскоўскія медыі. Маўляў, МЗС Расіі накіраваў у Мінск паперу пра магчымы выхад сваёй краіны з пагаднення 2002 года аб стварэнні роўных умоў у галіне цэнавай палітыкі. Намер тлумачыцца тым, што расійцам дасюль не прададзены, як было дамоўлена, акцыі "Белтрансгаза".

Каб было зразумела: Мінск, дамагаючыся смаленскіх (ці амаль што смаленскіх) коштаў на газ, трымаецца менавіта за пагадненне 2002 года пра роўныя цэнавыя ўмовы. І вось гэты козыр могуць выбіць з рук. Увогуле ж Масква пагражае ўлупіць дуплетам — задраць кошты на "блакітнае паліва" плюс падрэзаць нафтавую рэнту.

Таму 1 верасня, калі журналісты кранулі балючае пытанне, беларускі кіраўнік не стаў утойваць крыўды: *"Расія нам нафту прадае даражэй, чым Украіне... А цану на газ прапанавалі даражэй, чым Германіі. Хто б мог падумаць!"*.

Яшчэ болей, афіцыйны лідэр прызнаў: *"...Той, хто кажа, што хто-кольвек нас спрабуе шантажыраваць па цане на газ, маюць, напэўна, падставы"*.

Нагадаем: пра небяспеку імперскага шантажу даўно цвердзілі апазіцыйныя палітыкі і незалежныя эксперты. Але ж няма прарока ў сваёй айчыне! Іх білі за паклёп на братнюю інтэграцыю. Цяпер вось нарэшце афіцыйна пацвярджаецца, што за гэтай шырмай і насамрэч выкручваюць рукі.

Яўным дакорам Маскве прагучала з вуснаў Аляксандра Лукашэнкі і фраза пра тое, што *"яшчэ тыя людзі не памерлі, якія ў адных акопах з расійцамі і рускімі гінулі"*.

Гэта для Крамля трывожны сімптом. Пра ветэранаў, што гнілі ў акопах, ужо гаварылася два з паловай гады таму, падчас "першай газавай вайны".

Сімптаматычна прагучалі і яшчэ дзве заявы. Па-першае, што французы прапануюць някепскі праект АЭС. Гэта азначае, што з-пад носа ў расійцаў можа сплысці на Захад ласы кавалак — замова на мільярды долараў.

Дарэчы, незалежныя эксперты і раней раілі не надта зважаць на тое, што расійскі праект таннейшы. Гэтая іхняе "танна і сярдзіта" бокам можа вылезці — як пры запуску спадарожніка "БелКА".

Акрамя таго, беларускі кіраўнік паведаміў, што праекты ў галіне нафтаздабычы прапанавала Венесуэла. І гэта не пусты гук. Туды некалькі дзён таму паляцела сур'ёзная дэлегацыя — дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман і адказны за энергетыку віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. Будуць прасоўваць далей тое, пра што дамаўляліся падчас нядаўняга візіту ў Мінск прэзідэнта Уга Чавеса.

Ці сапраўды нам дапаможа такая вось нечаканая інтэграцыя праз Атлантычны акіян?

Думкі экспертаў разыходзяцца. Расійскі палітолаг **Сяргей Маркаў** падкрэслівае, што дастаўка энерганосьбітаў з Венесуэлы ў Беларусь — занятак надта дарагі. Ён можа быць часовым паратункам хіба што пры нейкім форс-мажоры — кшталту эканамічнай блакады. А вось беларускі аналітык **Юрый Шаўцоў** мяркуе, што, уклаўшы пэўныя сродкі ў нафтаздабычу за акіянам, Беларусь магла б з выгадай прадаваць "чорнае золата" — і не толькі Штатам, але і Кітаю. У Венесуэле могуць быць запатрабаваныя і нашы тэхналогіі нафтаперапрацоўкі.

Мінскі эксперт у галіне міжнародных стасункаў **Аляксандр Ціхаміраў** у сваю чаргу зазначае: *"Як сведчыць беларуская замежнапалітычная практыка, збліжэнне на палітычным узроўні далёка не заўсёды падмацоўваецца пашырэннем сувязяў у іншых сферах. Напоўніць дэкларацыі рэальным зместам — задача няпростая"*.

Кіраўнік навукова-даследчага цэнтра Мізэса **Яраслаў Раманчук** схільны лічыць размовы пра венесуэльскую альтэрнатыву *"ўсплёскам эмоцый у сітуацыі, калі беларускае кіраўніцтва мусіць рабіць цяжкі выбар"*.

У інтэрв'ю для "Народнай волі" эксперт зазначыў, што магчымыя даходы ад нафтавага бізнесу за акіянам не зробяць надвор'я — *"гэта будзе кропля ў моры"*. Дый напачатку трэба нейкія грошы ўкласці, а калі яны дадуць аддачу — бог ведае. Нарэшце, трэба ўлічваць аддаленасць. *"Пра значны эфект такіх планаў*, — жартуе эканаміст, — *можна было б казаць хіба тады, калі б Венесуэла у выніку нейкага тэктанічнага зруху апынулася на пяць тысяч кіламетраў бліжэй да Беларусі"*.

Тым часам апазіцыя, маючы на ўвазе энергетычны шантаж з боку Масквы, зазначае: вось да чаго давялі гульні ў інтэграцыю! Змарнаваны час, калі можна было, купаючыся ў танных энерганосьбітах, мадэрнізаваць нашу ненажэрную ў сэнсе паліва гаспадарку, наладзіць энергетычную альтэрнатыву.

Зрэшты, лепей позна, чым ніколі, дадаюць крытыкі. Дарэчы, адмыслоўцы заўважылі: на нарадзе з амбасадарамі ў жніўні афіцыйны лідэр фактычна актуалізаваў ідэю Балта-Чарнаморскага калектара, якую Зянон Пазьняк у агульных рысах прапагандаваў яшчэ ў 90-х гадах.

Дык што, масты ў імперыю спалены? Як сказаць...

Палітолаг **Валер Карбалевіч** у інтэрв'ю "Народнай волі" звярнуў увагу на такую супярэчнасць: *"На Дзень незалежнасці беларускі кіраўнік абвясціў, што ў нас ужо скончана будаўніцтва суверэннай дзяржавы. А ў Пінску, гаворачы пра імавернае ўвядзенне расійскага рубля, зазначыў, што найперш трэба вызначыцца, у якой дзяржаве будзем жыць"*.

Ці трэба гэта разумець так, што на пэўных умовах аб'яднальны праект не выключаецца?

Тым часам і расійскія медыі цвердзяць: рынкам, а кошт газу для Беларусі найперш будзе залежаць ад палітычнага рашэння Пуціна.

Іначай кажучы, Крэмль чакае ля расчыненай інтэграцыйнай пасткі. Так што Беларусь сапраўды балансуе на небяспечнай мяжы.

Народная Воля
8 ВЕРАСНЯ 2006 г.

ГУЧНАЯ СПРАВА

«Калі ў суддзяў ёсць сэрцы, яны прымуць рашэнне аб апраўданні абвінавачаных»

15 верасня ў Мінскім гарадскім судзе плануецца разгляд касацыйнай скаргі актывістаў незарэгістраванай арганізацыі “Партнёрства” Мікалая Астрэйкі і Цімафея Дранчука.

Адразу пасля прысуду Мікалай і Цімафей былі пераведзены з СІЗА КДБ у следчы ізалятар на Валадарскага.

“Суддзя Ясіновіч падпісаў дазвол на штотыднёвыя сустрэчы з сынам, — расказвае маці Мікалая Яўгенія Астрэйка. — *А ў аўторак мы даведаліся, што гэты дазвол ужо не дзейнічае. Я паехала ў Мінскі гарадскі суд. Спроба высветліць што-небудзь у старшыні суда скончылася нічым. Сакратарка не дазволіла зайсці ў кабінет старшыні, сказала: ”Чакайце разгляду касацыйнай скаргі”.*

На апошнім спатканні Мікалай скардзіўся на самаадчуванне. Ён моцна прастудзіўся. У камеры няма вады, праблемы са святлом, камера разлічана на 15 чалавек. Але Коля трымаецца. Ён аптымістычна настроены”.

Па словах бацькі асуджанага Цімафея Дранчука Валерыя, сын штодня піша дамоў па 5 лістоў. *“Што да ўмоў, то яны значна горшыя, чым у СІЗА КДБ,* — кажа Валерый Дранчук. — *Цімафея ўтрымлівалі ў паўпадвальным памяшканні з адноснай вентыляцыяй, яно было цалкам запоўненае. Спачатку ў камеры было 18 чалавек, потым 23. Я звярнуўся ў адміністрацыю СІЗА, званіў, што называецца, у званы. Не ведаю, ці гэта дапамагло, ці штосьці іншае, але Цімоха перавялі ў іншую камеру, на першы паверх, дзе ўтрымліваецца значна менш людзей.*

Ціма дапамагае асуджаным пісаць скаргі, кажа, што шмат хто сядзіць у турме ні за што. Цімафей зараз вучыцца на юрыдычным факультэце ЕГУ, і, дзякуючы кіраўніцтву універсітэта, працягвае навучанне нават за кратамі”.

Родныя Мікалая Астрэйкі і Цімафея Дранчука, а таксама Эніра Браніцкая і Аляксандр Шалайка, якія ўжо два з паловай тыдні на свабодзе, звярнуліся да ўсіх, каму не абыякавы лёс Мікалая і Цімафея, з заклікам прыйсці 15 верасня да будынка Маскоўскага гарадскога суда, каб падтрымаць хлопцаў. “Падтрымаць Свабоду і Годнасць”, — дадае Валерый Дранчук.

Жонкі Мікалая Астрэйкі і Цімафея Дранчука — Паліна (на фота справа) і Вольга спадзяюцца, што 15 верасня стане апошнім днём, які іх мужы правядуць за кратамі.

“Я маці, а не палітык, — кажа Яўгенія Астрэйка, — *дагэтуль пад уражаннем суда і вельмі жорсткага прысуду майму сыну. Два гады — за што? Гэта нават не пакаранне. Гэта гвалт. У Колі з Палінай у кастрычніку павінна нарадзіцца дачушка — хіба ж не змякчальныя акалічнасці? Хіба можна быць такімі бязлітаснымі там, дзе дэкларуецца справядлівасць? Абвінавачанне, па якім усе чацвёра адсядзелі шэсць месяцаў, было знятае з-за недаказанасці. Праўда і толькі праўда патрэбная. Праз колькі дзён будзе пераглядацца прысуд, значыць, трэба гэтую праўду сказаць, каб яе пачулі”.*

“У Цімафея дома сям’я, чакае пяцімесячны сын, якога ён не трымаў на руках, — гэта ўжо гаворыць маці Цімафея Дранчука Валянціна. — *Ціма вучыцца ва універсітэце. Я не ведаю, ці будзе гэта ўлічана. Ці будзе ўлічана права дзіцяці, майго ўнука Платона, на клопат, спагаду і дабрыню. Калі ў суддзяў ёсць сэрцы, яны прымуць рашэнне аб апраўданні абвінавачаных або хоць бы аб змякчэнні так званага прысуду. Але тое, што ўжо адбылося, мяне кідае ў роспач. Існуюць загады, а не маральныя нормы, замацаваныя ў шэрагу прававых дакументаў. Чым будзе кіравацца гарадскі суд, хутка пабачым. У судовай сістэмы яшчэ ёсць магчымасць зрабіць крок назад, апраўдаць тых, хто падаў скаргу на несправядлівы і жорсткі прысуд”.*

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

P.S. *Мікалаю Астрэйку і Цімафею Дранчуку патрэбна ваша падтрымка. Напішыце ім ліст за краты.*

Адрас: 220050, Мінск, Валадарскага, 2, СІЗА №1.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Пакуль не вядома, пры якіх акалічнасцях загінуў літоўскі дыпламат

Перадследчая праверка акалічнасцяў гібелі літоўскага дыпламата Вітаўтаса Пацюнаса павінна завяршыцца на працягу месяца. Пра гэта паведаміў БелаПАН начальнік упраўлення прававога забеспячэння, інфармацыі і грамадскіх сувязяў Пракуратуры Рэспублікі Беларусь Андрэй Швед.

Паводле яго слоў, тэрмін гэтай праверкі падоўжаны, у найбліжэйшыя тыдзень-два чакаецца заканчэнне шэрагу следчых даследаванняў. *“Нам патрэбны час для таго, каб зрабіць усе неабходныя судова-медыцынскія экспертызы”,* — падкрэсліў А.Швед. Звычайна перадследчая праверка *“этак і цягнецца — да трох тыдняў, у 10-дзённы тэрмін мы не ўкладваемся”,* зазначыў ён.

Да абнародавання вынікаў судова-медыцынскай экспертызы беларускімі праваахоўнымі органамі літоўскі бок не каментуе ні ход расследавання акалічнасцяў гібелі дыпламата, ні папярэднія вынікі свайго ўласнага расследавання. Пра гэта БелаПАН заявіла прэс-сакратар генеральнай пракуратуры Літвы Аўрэлія Юадытэ.

Нагадаем, цела В.Пацюнаса было знойдзена ў Брэсце 23 жніўня. Дыпламат прыбыў у абласны цэнтр напярэдадні і пасяліўся ў гатэлі “Інтурыст” у нумары на 9-м паверсе. Вечарам у складзе літоўскай дэлегацыі ён пабываў на прыёме ў генеральным консульстве Украіны ў Брэсце, а затым вярнуўся ў гатэль. Раніцай наступнага дня дыпламат быў знойдзены ля будынка гатэля мёртвым. Праведзеная 24 жніўня ў прысутнасці літоўскага спецыяліста судмедэкспертыза, паводле звестак беларускай пракуратуры, не сведчыць аб крымінальным характары смерці дыпламата, а хімічны аналіз паказаў наяўнасць у крыві загінуўшага 1,9 праміле алкаголю. Агляд нумара, дзе жыў Пацюнас, паказаў, што парадак у ім не быў парушаны, на месцы знаходзіліся асабістыя рэчы, дакументы і каштоўнасці, ложак быў запраўлены, уваходныя дзверы не зачынены, уключаны тэлевізар, акно адчынена.

Марына РАХЛЕЙ.

ДЫПКУР’ЕР

Джонатан МУР:

«Працаваць дыпламатам у Беларусі даволі няпроста»

Літаральна праз тыдзень — 18 верасня — у Мінск прыедзе новы пасол Злучаных Штатаў Амерыкі Карэн Сцюарт. Пакуль абавязкі амбасадара выконвае часовы павераны Джонатан Мур.

Джонатан Мур знаходзіцца ў Беларусі ўсяго толькі шэсць тыдняў. За гэты час ён паспеў пазнаёміцца і сустрэцца з прадстаўнікамі апазіцыі, папрысутнічаць на агалошванні прысуду членам “Партнёрства”, наведаць Гродна і Віцебск. І нават правесці прэс-канферэнцыю. Вось пра што ён гаварыў на сустрэчы з журналістамі.

Пра палітзняволеных

— Днямі нам не далі дазволу сустрэцца з палітзняволенымі, якія знаходзяцца ў следчым ізалятары Мінгарвыканкама, — гаворыць Мур. — Мы звярталіся з адпаведнай просьбай у Міністэрства замежных спраў, аднак у СІЗА нам паведамілі, што сустрэча не дазволена...

Мы працягваем настойваць на тым, каб беларускія ўлады вызвалілі ўсіх палітзняволеных...

Пра дыпламатаў

— Працаваць дыпламатам у Беларусі даволі няпроста. Мы ўжо вельмі красамоўна выказалі свой пратэст супраць таго, як абышліся з нашым латвійскім калегам. Гэта абсалютна беспрэцэдэнтна — здымаць дыпламата ў яго доме, потым паказваць па нацыянальным тэлебачанні, урываццa ў кватэру. І асобны выпадак, які нас вельмі сур’ёзна непакоіць, — гэта смерць нашага літоўскага калегі. Наколькі мы разумеем, і літоўскія, і беларускія ўлады праводзяць расследаванне гэтай справы, і мы з нецярпеннем чакаем магчымасці даведацца аб ягоных выніках.

Пра бізнес

— Шмат якія амерыканскія кампаніі лічаць, што гэта велізарная рызыка — інвестыцыі ў Беларусь і праца тут. Невядома, ці бяспечныя будуць гэтыя інвестыцыі. Ці не ўзнікне ва ўладзе нейкая новая заканадаўчая ініцыятыва, якая пазбавіць кампанію гэтых інвестыцый, заблакуе рэсурсы ці адбярэ ўласнасць? Многія кампаніі на такую рызыку не ідуць. Аднак некаторыя амерыканскія кампаніі ўсё ж такі працуюць на беларускім рынку.

Пра свабоду слова

— Я казаў пра той ціск, які аказваецца ў Беларусі на дыпламатаў. Аднак я б не стаў параўноўваць цяжкасці, з якімі сутыкаемся мы, дыпламаты, з тымі складанасцямі, якія амаль кожны дзень перажываюць прадстаўнікі незалежных сродкаў масавай інфармацыі. Гэта людзі, на якіх не распаўсюджваюцца гарантыі бяспекі, якія прадстаўляе, напрыклад, Венская канвенцыя. Яны працуюць у надзвычай цяжкіх умовах, беспрэцэдэнтных для большасці краіны Еўропы. Многія краіны пазбавіліся ад рэпрэсій і цяпер там журналісты пішуць і расказваюць пра тое, пра што лічаць неабходным. Мы вельмі занепакоены, што ў Беларусі гэта не так. І хочам, каб тут існавала сапраўдная свабода слова.

Апошнім часам на Беларускім тэлебачанні з’яўляецца шмат сюжэтаў пра Амерыку. І калі нехта зноў выдумае нешта фантастычнае, мы заўсёды гатовыя сустрэцца з журналістамі, каб сказаць праўду. Праўда, я не лічу вельмі карысным, каб пасольства рэагавала на кожны з такіх выпадкаў. Калі будзем гэта рабіць, то пачнем нейкім чынам легалізаваць тое, што робіць улада...

Пра чыноўнікаў

— Што тычыцца санкцый наконт некаторых беларускіх чыноўнікаў, то нашы намаганні, як і намаганні нашых еўрапейскіх калег, скіраваныя супраць пэўных асобаў у кіраўніцтве рэжыму. Гэтыя людзі адказныя за рэпрэсіі супраць беларусаў. І забарона на ўезд мае даволі канкрэтны вынік. Дарэчы, не выключана, што спіс неўязных чыноўнікаў будзе пашыраны...

Няма ніякага разгляду пытання аб эканамічных санкцыях супраць Беларусі. У найноўшай гісторыі Еўропы ёсць прыклады ўвядзення падобных санкцый. Гэтыя прыклады прадэманстравалі, што санкцыі супраць насельніцтва поспеху не маюць. Рэжым можа выжыць, а насельніцтва — галадае. Рэжым можа атрымаць нават плюсы ад жабрацтва людзей. Наша мэта не ў тым, каб ізаляваць беларускі народ.

Пра візіт Лукашэнкі ў Гавану

— Мы ведаем, што Лукашэнка ў хуткім часе збіраецца з візітам у Гавану. І зараз абмяркоўваем з Дзярждэпартаментам, як гэтыя планы будуць ажыццяўляцца. Я не магу адказаць, ці сутыкнецца самалёт кіраўніка беларускай дзяржавы з тымі ж цяжкасцямі, з якімі сутыкнуўся самалёт прэм’ер-міністра пры пералёце на Кубу. Як пасольства мы не ўпаўнаважаны займацца дазволамі на пералёт, іх павінен даваць урад у Вашынгтоне.

Марына КОКТЫШ.

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Джонатан Мур, намеснік амбасадара ЗША ў Беларусі.

З 1995-га па 1999 год працаваў ў Літве.

З’ехаў з Літвы амаль адразу пасля таго, як туды з Беларусі пераехаў старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Сямён Шарэцкі. Быў адным з першых дыпламатаў, з якімі Шарэцкі меў зносіны ў Літве.

Працаваў у офісе спікера Палаты прадстаўнікоў у Вашынгтоне, быў намеснікам старшыні Дэпартамента, які адказваў за адносіны з Расіяй.

Па ўласным прызнанні, апошнія гады шукаў магчымасць атрымаць прызначэнне ў Беларусь.

Называе сябе сябрам былога амбасадара ЗША ў Беларусі Джорджа Крола. У бліжэйшым будучым Мур, як і Крол, плануе загаварыць на беларускай мове, якую зараз актыўна вывучае.

Джонатан Мур абяцае, што амбасада ЗША будзе больш актыўна працаваць у галіне культурных зносін і стане больш адкрытай для прэсы.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Игорь МАКАР, бывший сотрудник «Алмаза»:

«Моим коллегам запрещали со мной общаться из-за того, что я был рядом с Александром Козулиным...»

На судебном процессе по делу Александра Козулина защита последнего ходатайствовала о допросе бывшего сотрудника спецподразделения “Алмаз” Игоря Макара, который после событий 17 февраля в Национальном пресс-центре предупредил экс-кандидата в президенты о том, что против него готовятся провокации. Суд это ходатайство отклонил...

Именно Игорь Макар сопровождал Александра Козулина во Дворец культуры железнодорожников на регистрацию делегатом Всебелорусского народного собрания. Бывший сотрудник “Алмаза”, который сейчас находится в одной из стран Евросоюза, готов был приехать в Минск и дать под гарантию обеспечения его безопасности развернутые свидетельские показания. Но они, как оказалось, суду абсолютно не нужны. Правда, сам Игорь Макар прислал по электронной почте письмо, в котором сообщил о том, что бы он хотел рассказать суду.

“Мне было больно смотреть на то, как бойцы СПБТ ”Алмаз” 2 марта 2006 года избили кандидата в президенты, профессора Александра Козулина, — пишет бывший “алмазовец”. — *Как возле РУВД были избиты и задержаны ни в чем не виновные граждане и журналисты. Как командир столь элитного подразделения в мирное время произвел выстрел из табельного оружия и не понес за это ответственности... Наблюдая репрессии, издевательства над личностью, беззаконие, которое творится в спецслужбах, я не могу больше молчать. Понимая, что моей жизни может угрожать опасность, я, невзирая ни на что, буду бороться до конца за человека, которому не безразлична судьба нашей страны, за человека, который шел на самые крайние меры, чтобы народ Беларуси вздохнул от бесконечного унижения”.*

Игорь Макар, проработавший в “Алмазе” около пяти лет, рассказывает, что только из-за того, что он находился рядом с кандидатом в президенты Александром Козулиным, руководство спецподразделения запрещало его рядовым сотрудникам общаться с ним, хотя тайно те и встречались. По словам Макара, они честно признавались, что в подразделении проходил сбор подписей в поддержку Александра Лукашенко, а 2 марта 2006 года, когда был избит и задержан Козулин, “была запланированная работа”.

“За несколько недель до выборов меня постоянно разыскивал руководитель ”Алмаза” Н.Карпенков, — сообщает экс-"алмазовец". — *Я приезжал к нему на встречу. Мы часами беседовали. Н.Карпенков мне постоянно говорил, что я позорю подразделение, что эта машина все и всех перемелет. Но, простите, если я общаюсь с кандидатом в президенты, точно таким же как А.Г.Лукашенко, значит я — изгой? Почему эта несправедливость имеет вес в таком государстве, почему все люди молчат?.. У меня есть запись нашего разговора с министром внутренних дел В.В.Наумовым, который происходил в СПБТ “Алмаз”. Там я понял, что А.В.Козулина при любых обстоятельствах задержали бы и подвергли суду”.*

Игорь Макар обращается ко всем своим бывшим коллегам с просьбой не совершать преступлений против народа, стыдит своих коллег из элитного спецподразделения за унижения на судебных процессах и заявляет, что подготовил обращение к Герою России, председателю братства краповых беретов “Витязь” С.И.Лысюку о сдаче своего крапового берета.

“Такой поступок я совершаю ради свободы А.В.Козулина и в знак протеста против нынешнего белорусского режима”, — говорит Игорь Макар.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

ЗДАРЭННЕ

Трагедыя ў Скідзелі

Два чалавекі пацярпелі на рынку ў горадзе Скідзель Гродзенскай вобласці ад падзення бетоннай агароджы. Пліта, якая выкарыстоўвалася як плот, прыціснула дзвюх жанчын-пенсіянерак. Адна з іх атрымала чэрапна-мазгавую траўму, другая загінула на месцы.

Выконваючы абавязкі старшыні Скідзельскага райспажыўсаюза Дзмітрый Тарашчык распавёў, што абрушэнне пліты адбылося ад удару легкавіка. Кіроўца “Рэно” прыпаркаваў машыну ў некалькіх метрах ад агароджы і пайшоў за пакупкамі. Паводле слоў спадара Тарашчыка, аўтамабіль пакаціўся пад ухіл і ўдарыўся ў стык паміж бетоннымі плітамі. Ад штуршка адна з пліт упала. Як сцвярджаюць мясцовыя жыхары, гэтая частка агароджы, пабудаванай на рынку ў Скідзелі некалькі гадоў таму, падае ўжо не ўпершыню. У апошні раз пліта абвалілася ў мінулым годзе, але тады ніхто не пацярпеў.

www.naviny.by

СІТУАЦЫЯ

Энцыклапедыя на выселках

Супрацоўнікі рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства “Выдавецтва ”Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" лічаць нямэтазгодным перавод выдавецтва з будынка ў цэнтры Мінска (па вуліцы Акадэмічнай, 15а) у шматпавярховы будынак на ўскрайку сталіцы (па вуліцы Сцебянёва, 20, корпус 2).

Пра гэта заявілі члены ініцыятыўнай групы, створанай калектывам супрацоўнікаў выдавецтва на пасяджэнні прафкама для звароту да ўладаў. Яны паведамілі, што восенню 2005 года выдавецтва наведалі прадстаўнікі Вышэйшага Гаспадарчага суда, пасля чаго адміністрацыя БелЭн, а таксама вядомыя дзеячы нацыянальнай навукі і культуры звярнуліся да кіраўніка дзяржавы і ў Адміністрацыю прэзідэнта з просьбай пакінуць будынак за выдавецтвам. Затым адміністрацыя БелЭн атрымала распараджэнне прэзідэнта ад 13 сакавіка г.г. аб бязвыплатнай перадачы будынка Гаспадарчаму суду Мінска. А праз пяць дзён было выдадзена новае распараджэнне кіраўніка дзяржавы аб выдзяленні сродкаў на рэканструкцыю будынка па вуліцы Акадэмічнай, 15а.

Паколькі плошчы, прадугледжаныя для БелЭн, знаходзяцца ў Кастрычніцкім раёне сталіцы побач з Мінскай кальцавой аўтадарогай, далёка ад прыпынку грамадскага транспарту, члены ініцыятыўнай групы лічаць, што перасяленне ў гэты аддалены раён раўнасільна смерці для выдавецтва, з якім супрацоўнічаюць вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук і сталічных універсітэтаў, а таксама вядомыя дзеячы нацыянальнай культуры. Апрача таго, прапанаваныя памяшканні з іх камунікацыямі і сродкамі сувязі не адпавядаюць патрабаванням, што прад’яўляюцца для выдавецтва, і іх рэканструкцыя патрабуе значных капіталаўкладанняў.

У связі з тым, што ўсе прапановы членаў ініцыятыўнай групы, выкладзеныя ў шматлікіх лістах да ўладаў, не былі задаволеныя, пачаўся адток кадраў. Толькі з 22 чэрвеня г.г. звольніўся з працы ў БелЭн кожны чацвёрты супрацоўнік, а ў выпадку, калі выдавецтва ўсё ж будзе пераведзена ў новы будынак па вуліцы Сцебянёва, прадпрыемства мае намер пакінуць кожны другі спецыяліст.

Сярод магчымых прычын сітуацыі з пазбаўленнем выдавецтва свайго будынка члены ініцыятыўнай групы называюць няўзгодненасць дзеянняў улады, іх ідэалагічнае непрыманне шэрагу выданняў БелЭн, а таксама эканамічную зацікаўленасць дзяржавы ў будынку па вуліцы Акадэмічнай.

Марат ГАРАВЫ.

Народная Воля
8 ВЕРАСНЯ 2006 г.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Не спыніць, не суняць

Вольга ІПАТАВА

Так сталася, што выпадак раптоўна і зусім нечакана звёў мяне з адным з тых пісьменнікаў, што ўступілі ў новаствораны, ці, як яго цяпер называюць, праўладны творчы саюз. Звёў у раёне, дзе нас абаіх запрасілі выступіць на фальклорным свяце, мабыць, яшчэ не прачытаўшы строгіх лістоў Міністра адукацыі і інструкцый міністэрства культуры аб "сваіх" і "чужых," па якому маё выступленне мусіла адбыцца толькі з дазволу сакратаркі абласнога аддзялення.

Мы даўно і добра знаёмыя, не раз бывалі разам на семінарах, адгукаліся пра адзін аднаго ў друку, і я, ведаючы, што мой былы калега недзе тут, пакутліва рашала для сябе — ці павітацца з ім, ці ўсё ж зрабіць выгляд, быццам яго не заўважаю.

Вітацца і падаваць руку не выпадала: *"той"* саюз пераступіў праз мноства маральных "табу", якія немагчымыя сярод прыстойных людзей. Варта ўзгадаць, як з *АМАПам* выводзілі з залы пасяджэнняў, дзе ствараўся гэты саюз, пісьменнікаў — кіраўнікоў СБП, як учарашнія калегі, не паспеўшы правесці свой гвалтоўна-прымусовы з'езд, ужо абвінавачвалі старэйшы творчы саюз у вялізных грошах, якія нібыта ідуць праз СБП, як, атрымаўшы ад улады картбланш на знішчэнне непакорнага творчага саюза, ініцыявалі ганебныя "забароны на выступленне"... Як расказваюць бібліятэкары — нашыя заўсёдныя саюзнікі, новыя начальнікі нібыта нават тэлефанавалі па ўсіх абласных і раённых бібліятэках, палохаючы строгімі мерамі, калі там будуць прымаць "недазволеных". Ім падалося мала таго, што вось ужо больш за дзесяцігоддзе пісьменнікі амаль не паказваюцца на тэлебачанні, што на радыё даўно выступаюць толькі "свае", а чужых нават не ўзгадваюць. Што былыя выданні Саюза беларускіх пісьменнікаў наладзілі цэнзуру не горш за колішняе КДБ...

І за ўвесь гэты бруд у любым выпадку адказны кожны з ІХНЯГА творчага асяродку, якому дазволілі называць сябе Саюзам пісьменнікаў Беларусі, нягледзячы на тое, што і пасёння асноўныя творчыя сілы, у тым ліку і ўсе народныя пісьменнікі — тут, у гэтым, нялюбым для ўладаў, але жывым і дзейсным творчым пісьменніцкім хаўрусе.

Сустрэча наша, на шчасце, не адбылася: пісьменнік, відаць, пабачыўшы мяне, знік — не адгукаўся на заклікі са сцэны, не падыходзіў да вядучай. І я, шчыра кажучы, парадавалася гэтаму: значыць, не страціў ён да канца сумленне, разумее, што "ўліп". Што спакусіўся на тое, у што заманьвалі абяцанкамі друкавання кніжак і будучымі матэрыяльнымі дабротамі.

Сумленне — тонкая, нябачная воку, але вельмі адчувальная для душы субстанцыя. І ў пісьменніка, калі ён шчыра служыць літаратуры, калі разумее, што талент дадзены яму Усявышнім — сумленне яго часцяком якраз і бывае самым галоўным компасам жыцця.

Сумленне вяло праз жыццёвыя нягоды нашых вялікіх папярэднікаў — Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, "мужыцкага адваката" Багушэвіча, калі яны ўзломвалі лёд пагарды да беларуса і ягонай "хамскай" мовы. Сумленне кіравала рукой Янкі Купалы, калі ён спрабаваў абарваць стасункі з жыццём, бо пятля нялюдскай сістэмы захліствала горла і патрабавала адрачэння ад таго, што ён любіў, што яму снілася, нягледзячы ні на што — а сніліся яму "сны аб Беларусі."

Сумленне дыктавала вялікаму Васілю Быкаву і ягоныя ваенныя творы, і, пазней, ягоныя прыпавесці і прытчы, якія навекі застануцца сведкамі сённяшняй палітычнай сістэмы, створанай с пастаянным падаўленнем гэтай, паводле Гітлера, "хімеры" — чалавечага сумлення. Мне часам здаецца, што яно, можа, толькі адно і стаіць між дыктатурай і асобным, слабым перад таталітарным, усеахопным панаваннем няпраўды чалавекам.

У бясконцых спіралях Гісторыі мы адкрываем для сябе безліч прыкладаў таго, як гэты асобны, слабы чалавек стаяў супраць Сістэмы і, нават зломлены фізічна, усё ж перамагаў яе сілай свайго духу, падмацаванага Сумленнем.

Нам нашмат лягчэй, чымся было калісьці, у савецкія часы, калі чалавек не разумеў, што адбываецца: ён верыў у будучае, у ідэалы камунізму, а яны абарочваліся страшным скажэннем, пакутамі і крывёй. Гэты шлях ужо пройдзены чалавецтвам, і нават мы, беларусы, колькі стагоддзяў забытыя еўрапейскай гісторыяй, сёння маем магутную падтрымку цывілізаванага свету, а значыць, кожны з нас ужо — не адзін. Нас шмат, і хаця не столькі, каб дванаццаць гадоў таму ўвогуле не дапусціць дыктатуры, не дапусціць такога развіцця падзей, як у сённяшняй Беларусі, аднак і не так мала, каб даць ізноў забыцца пра сябе, апусціцца ў дрымлівасць "Северо-Западного" краю і паволі канаць як народ...

На пахаванне народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля прыйшло шмат людзей. Шмат для пякучага поўдня, шмат для ўмоў, пры якіх адно Радыё Свабода паведаміла, дзе і ў колькі адбудзецца жалобная цырымонія, а афіцыйныя сродкі інфармацыі — ні слова.

Ганебна, што праводзіць Івана Антонавіча ў вечны шлях не прыйшоў ніводзін нават самы дробны чыноўнік міністэрстваў адукацыі і культуры, ані кіраўнікі новастворанага Саюза пісьменнікаў, не кажучы ўжо пра нашых былых калег. Не веру, што ніводнаму з іх сорамна і прыкра не было, аднак страх за сваё дробнае ці то карытца, ці то пасаду ўтрымаў іх больш надзейна, чым штурхала наперад сумленне. Што ж — гэты час сапраўды стаўся лакмусавай паперай для ўсіх, і ніколі яшчэ раздзяленне беларускага грамадства не было такім усеаб'ёмным і — страшным.

Страшным таму, што на тым, *ІХНІМ*, баку дазволена ўсё: і няправедныя суды над іншадумцамі, і хлусня, і правакацыі. Ці ж не правакацыі — пастаянныя здзекі з ГА "Таварыства беларускай мовы", сядзібу якога апаганьваюць ненавіснікі беларускага, альбо макеты выбуховага прыстасавання ля сядзібы БНФ, альбо выгнанне з сядзібы згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына"? А пераслед іншаверцаў? А здзекі ў выглядзе ўсялякіх допытаў з правадзейнага, законна абранага кіраўніцтва Саюза палякаў? Ці, нарэшце, гэтае пастаяннае патрабаванне пяцідзесяці пяці мільёнаў нібыта доўгу з Саюза беларускіх пісьменнікаў, у той час як гэта *ЯНЫ* павінны нам невымерна болей за нашыя два будынкі ў цэнтры сталіцы, якія эксплуатуюцца імі, што называецца, "у хвост і грыву" вось ужо дзевяць гадоў?

Аднак жа цяпер, калі яны ўжо канчаткова вырашылі выгнаць нас з нашага Дому, яны ўжо нават не хочуць грошай, тых самых мільёнаў рублеў, якія нам налічылі. Яны не пайшлі насустрач, калі кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў прапанавала выплаціць іх, сабраць, звярнуўшыся да грамадскасці. І стала вельмі выразна бачна, якою ж косткаю ў горле стаўся ім гэты нязломны творчы Саюз, які ім так хочацца знішчыць. Знішчыць нават паняцце "Дом літаратара", бо само ўжо гэтае паняцце сталася сімвалам супраціўлення, нават як віртуальная рэальнасць. Так, віртуальная, бо два пакоі ў самім гэтым цяперашнім "Корпусе па Фрунзе, 5", якія мы займаем, — гэта зусім не Дом літаратара, а толькі маленькая выспачка, якую яны праз суды і гвалт усе ж такі забралі, ці, дакладней, выштурхнулі з-пад ног...

Як бы новаствораны праўладны Саюз ні выпінаўся, якіх бы народных пісьменнікаў ці пісьменніц ён ні рыхтаваў, каб хаця неяк зраўняцца з нашым, усё роўна гэта ім не ўдасца. Якую энергію ён акумулюе? Стваральную? Не, бо ён падтрымлівае палітыку ўлады, дзе вось ужо другое дзесяцігоддзе ідзе пастаянны наступ на ўсе беларускае — на мову, культуру, гісторыю. Ён падтрымлівае наступ на дэмакратычныя каштоўнасці, дзе самае важнае — цана чалавечага жыцця. У *ІХНЯЙ* ідэалогіі, якая вяртае на Беларусь культ Сталіна, жыццё чалавечае нічога не вартае, яно ўсяго толькі "лагерны пыл." І таму яны, што падтрымліваюць культ Сталіна, топчуць памяць соцень сваіх жа папярэднікаў — беларускіх пісьменнікаў, якіх расстралялі, знішчылі, згнаілі ў канцлагерах, зледзянілі ў страшнай Сібіры. За гады сталінізму ў нашай краіне загінула восемдзесят працэнтаў пісьменнікаў — куды болей, чым у іншых рэспубліках і ў самой Расіі. Якое імя са старэйшага пакалення ні ўзгадай, кожнае крыватычыць, кожны творца заплаціў страшную цану, і не толькі сам, але і ягоная сям'я. Тыя, што выжылі ў ссылках, не заўсёды маглі вярнуцца на радзіму, бо нішчылася іхняе жытло, нават самі ўспаміны пра іх. Яшчэ не створаныя пра іх кнігі, яшчэ не пра ўсіх напісалі і ўшанавалі — хаця б пасмяротна... А яны, праўладныя творцы, пнуцца, галёкаюць, славяць, не хочучы думаць, што ўсё, пра што яны сёння пішуць, што так паспешліва ствараецца на нашых вачах, распаўзецца, раз'едзецца, рассыплецца ва ўсе бакі, як толькі прыйдзе час зменаў. Яно не замацавана ні любоўю, ні ахвярамі, ні гарэннем — усім тым, што было пакладзена ва ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), якая адзіная была сапраўднай беларускай дзяржавай, незалежнай ад чужаніцаў. БНР праіснавала нядоўга — але яна жывая і пасёння, мы арыентуемся на яе, як на недасяжны пакуль што ідэал, які ўсё ж некалі паўстане і пачне жыць злітна з нацыяй, даючы ёй накірункі на будучыню. Такі закон жыцця: тое, што мацуецца гвалтам і няпраўдай, не мае будучыні, і наадварот.

Вось жа — вынішчалі, сціралі ўсе сляды, нават хоць нейкі ўспамін пра падзеі 25 сакавіка 1918 года, пераследавалі па ўсім свеце носьбітаў ідэі дэмакратычнай нацыянальнай Беларусі — а як толькі пахіснулася каменная сцяна таталітарызму, ажыла народная памяць — і на абломках Савецкага Саюза была абвешчана незалежная Беларусь. У ёй непазбежна адразу ж пачалося вяртанне імёнаў тых сыноў і дачок Бацькаўшчыны, якія праз вякі служылі ёй і аддавалі свае сілы на яе будаўніцтва, верылі ў яе будучае. Праўда, у сённяшніх умовах толькі нямногія ацалелыя незалежныя дэмакратычныя выданні — такія, як "Народная воля", "Наша слова", "Наша Ніва" ды лепшы ў сённяшнім літаратурным свеце часопіс "Дзеяслоў" узгадваюць пра слаўных дзеячаў Беларусі, што працавалі на яе свабоду — але ж узгадваюць, пішуць, будзяць нацыянальную памяць. Холдынгавыя ж выданні, дзе таксама працуюць пісьменнікі, не пішуць ані пра дзеячаў БНР, ані ўдзельнікаў трох паўстанняў на Беларусі (напрыклад, хаця б пра сёлетні юбілей Міхала Валовіча, якога павесілі па загадзе Мураўёва-вешальніка, а магілу знішчылі па загадзе ўжо сталіністаў), не пішуць нават пра памерлых сваіх калег, затое з нумара ў нумар друкуюць сябе, дарагіх і любімых. Дзіўна: няўжо ім незразумела, што той сегмент беларускага грамадства, які любіць беларускую літаратуру і яе сённяшніх творцаў, ніколі не прыме тых, хто на баку яе ганіцеляў? Выкарыстаюць іх — і ўсё роўна пагоняць вон, нягледзячы на ўсе эпіталамы ў адрас улады, якая па сваёй сутнасці на дух не пераносіць беларускае! Ці ж мы ўжо не маем такіх прыкладаў, калі цэлыя арганізацыі нават выганяюць з іхніх будынкаў, нягледзячы на тое, што кіраўнікі дэманстравалі не проста лаяльнасць — але самую сапраўдную "сабачую вернасць"?

Мне як кіраўніку Саюза ў 1998—2002 гг. давялося хаваць каля сотні пісьменнікаў. І як жа няёмка і скрушна было, калі на пахаванне прыходзіла ўсяго каля дзесятка чалавек, хаця мы тэлефанавалі ўсім! Такіх выпадкаў было няшмат, але гэта заўсёды супадала з тым, кім быў нябожчык пры жыцці. Калі ён, будучы нават таленавітым, занадта гнуўся перад уладай, то можна было адразу прагназаваць — натоўпаў ля труны не будзе. Да тых жа, хто аддана служыў Беларусі, прыходзяць і праз дзесяцігоддзі пасля іхняе смерці, як штогод збіраюцца, напрыклад, ля магілаў Уладзіміра Караткевіча, Ларысы Геніюш, Васіля Быкава...

Усе яны — гонар нашага творчага Саюза, бо ніводзін з іх не зламаўся, не пабег у заваблівасць салодкіх абяцанняў і не прадаў сваёй душы.

Літаратура — жорсткая рэч. Яна патрабуе ўсяго цябе, а ў нашых умовах і больш за тое. Ты мусіш быць змагаром, а не проста адседжвацца ў "вежы са слановай косткі"(Марсель Пруст). У знявераным, зрусіфікаваным грамадстве, дзе пануе страх, нялёгка шукаць аднадумцаў і ім перадаваць гарэнне тваёй душы, твой боль за Беларусь і надзею на яе будучыню. Мы, безумоўна, не палітыкі, наша поле — маральныя каштоўнасці і культ прыгажосці, дабрыні і любові, а ніяк не культ гвалту і ўладалюбства. І не нашая віна, што гэтыя катэгорыі ў сённяшнім нашым грамадстве не супадаюць з тымі, што прапагандуе сучасная ідэалогія. Пісьменнік не можа быць раўнадушным, калі за краты кідаюць маладых людзей, уся віна якіх у тым, што яны хацелі ведаць праўду аб выбарах. Не можа цешыцца радасцямі жыцця, калі імі не даюць цешыцца тым, хто ўсяго толькі не згодны ілгаць або гуляць па правілах несумленнасці. Усе пасланыя на "хімію" хлопцы — гэта нашыя гонар і сумленне, і маўчаць пра іх, тых, хто сёння замест стваральнай працы зэкамі жыве пад міліцэйскім наглядам мы, творцы, не маем маральнага права.

Напісала *"мы, творцы"* — і спынілася. Часам раздаюцца галасы, што беларускай літаратуры, маўляў, няма, ёсць толькі "купка разгубленых літаратараў", якія не ведаюць, што рабіць.

Калі б гэта было так, то нам бы не забаранілі выступаць ва ўстановах культуры і школах.

Калі б гэта было так, то нас не праследавалі б судамі, не імкнуліся б знішчыць нашу бібліятэку, нашыя святыні і нашыя архівы.

Калі б гэта было так, то не стараліся б бяздарныя выжлы зачыніць нам дзверы ва ўсе сродкі масавай інфармацыі.

А раз яны г э т а к стараюцца, то, выходзіць, ёсць за што.

І гэтае "ШТО" ім сапраўды "не спыніць, не стрымаць, не суняць".

АКЦЫЯ

Ці дазволяць гарадскія ўлады «Большой джинсовый фэст»?

"Большой джинсовый фэст" запланавана правесці на мінскай плошчы Бангалор 16 верасня ў 16.00.

— Калі дазволяць гарадскія ўлады, будзе канцэрт з удзелам вядомых беларускіх рок-гуртоў і выканаўцаў, — распавёў карэспандэнту "Народнай волі" адзін з ініцыятараў правядзення канцэрта **Зміцер ДАШКЕВІЧ**. — Мерапрыемства ў большай ступені апалітычнае, хоць і мяркуецца, што пройдзе пад лозунгам "За свабоду!", а сам канцэрт прысвечаны салідарнасці са зніклымі і рэпрэсаванымі палітыкамі. Заяўка пададзена, зараз (прыкладна 11 верасня) чакаем адказ. Дарэчы, у заяўцы мы ўказалі, што збор людзей хочам правесці каля кінатэатра "Кастрычнік", а ўжо адтуль маем намер прайсці да плошчы Бангалор.

Па словах Зміцера Дашкевіча, калі дазволу на правядзенне мерапрыемства не будзе дадзена, канцэрт не адбудзецца — на абвастрэнне сітуацыі арганізатары ісці не збіраюцца.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Новая хваля вобыскаў

У Мінску і Віцебску прайшлі вобыскі ў кватэрах маладзёжных дэмакратычных актывістаў. Пра гэта БелаПАН паведаміў грамадскі актывіст Кірыл Ігнацік.

Паволе яго інфармацыі, вобыскі праведзены ў Жанны Ямайкінай, Мікіты Абраменкі і Юрыя Ягорава. Раніцай супрацоўнікі міліцыі пад рознымі прычынамі званілі ў кватэры, дзе жывуць маладыя людзі, і пачыналі праводзіць вобыскі. Пастановы на вобыскі былі падпісаныя віцебскім следчым Вольгай Зіль.

Як паведаміў К.Ігнацік, у Ж.Ямайкінай кафіскавалі мабільны тэлефон і камп'ютэр, у Ю.Ягорава — камп'ютэр, некалькі ўлётак з заклікам браць удзел у "Чарнобыльскім Шляху-2006". *"Ва ўсіх забіралі штотыднёвікі, нататнікі, розныя паперы на свой погляд. Любыя паперы, якія маглі ўтрымліваць якія-небудзь звесткі аб любых людзях"*, — зазначыў К.Ігнацік. Таксама ён паведаміў, што М.Абраменку пасля вобыску павезлі на допыт.

К.Ігнацік нагадаў, што 26 ліпеня аналагічныя вобыскі былі праведзены ў маладзёжных актывістаў Тацяны Дзядок, Тацяны Елавой, Яўгена Бабковіча і сясцёр Алены і Кацярыны Казак.

Вобыскі праводзяцца ў межах крымінальнай справы, распачатай паводле падзей у Віцебску 18 чэрвеня гэтага года. Тады ў горадзе прайшоў шэраг акцый. Падчас адной з іх маладзёжная актывістка магіляўчанка Крысціна Шацікава прымацавала да асвятляльнай вежы ў цэнтры горада, ля Летняга амфітэатра, белчывона-белы сцяг, за што была аштрафаваная на 150 базавых велічыняў. Апрача таго, былі затрыманы некалькі маладых людзей, якія распаўсюджвалі ўлёткі. У горадзе таксама з'явілася расцяжка з надпісам "Бунт" і графіці. У дачыненні да студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта — 21-гадовай Т.Елавой з Мінска і 27-гадовага Дзяніса Дзянісава з Віцебска — была распачата крымінальная справа. У афіцыйным міліцэйскім паведамленні ўказвалася, што *"гэтыя грамадзяне падрыхтавалі, спланавалі і арганізавалі правядзенне на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна Віцебска масавай несанкцыянаванай акцыі, скіраванай на грубае парушэнне грамадскага парадку і зрыў культурна-масавых мерапрыемстваў"*.

Сяргей ПУЛЬША.

SOS!

Толькі кожны пяты

школьнік вучыцца ў школе з беларускай мовай навучання

Дваццаць з паловай працэнтаў школьнікаў Беларусі вучацца ў школах з беларускай мовай навучання. Яшчэ 12,7% — у школах з рускай і беларускай мовамі навучання. У рускамоўных школах вучыцца 66,7% дзяцей. Пра гэта афіцыйна паведаміў начальнік аддзела збору і аўтаматызаванай апрацоўкі звестак галоўнага інфармацыйна-вылічальнага цэнтра Міністэрства адукацыі **Аляксандр ПАПОЎ.**

За апошнія гады гэтыя лічбы мяняліся нязначна: у 2005 годзе беларускамоўныя школы наведвалі 23,3%, рускамоўныя — 76,7% чалавек, у 2004 годзе — адпаведна 23,8 і 76,1%. Пры гэтым, згодна са звесткамі статыстыкі, беларускамоўных школ у Беларусі 2313, рускамоўных — 1432, з дзвюма мовамі навучання — 258. У 2005 годзе было адпаведна 2428, 1366, 307, а ў 2004-м — 2503, 1337 і 366 школ.

"Самая кепская сітуацыя ў нас у сталіцы — 234 сярэднія навучальныя ўстановы, а на беларускай мове працуе толькі чатыры гімназіі. Есць яшчэ 43 школы з дзвюма мовамі навучання, дзе ёсць асобныя беларускія класы", — зазначыў старшыня ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Алег Трусаў. Ён таксама назваў рэгіёны Беларусі, дзе сёння найменш беларускамоўных школ і вучняў, — гэта Магілёўшчына, Гомельшчына і Віцебшчына. *"У Магілёве нават няма ніводнага класа, дзе б дзеці вучыліся па-беларуску"*, — падкрэсліў А.Трусаў. А самая лепшая сітуацыя ў Мінскай вобласці — у Капыльскім і Нясвіжскім раёнах.

Паводле слоў А.Трусава, наяўную сітуацыю можа яшчэ больш пагоршыць рашэнне Міністэрства адукацыі, згодна з якім гісторыю Беларусі ў рускамоўных школах дазваляецца выкладаць па-руску. *"Гэта рэзка абмяжоўвае выкладанне беларускай мовы ў рускамоўных школах"*, — падкрэсліў А.Трусаў.

Старшыня Таварыства беларускай мовы таксама нагадаў гады, калі распаўсюджанне беларускай мовы ва ўстановах Міністэрства адукацыі было найбольш шырокім. Паводле яго слоў, у 1994—1995 гадах, да рэферэндуму 1995 года, прыкладна 70% першакласнікаў вучыліся на беларускай мове. *"Пасля рэферэндуму на беларускай мове навучання засталася прыкладна палова вучняў, а затым і палова ад паловы"*, — сказаў А.Трусаў.

Настасся ЯНУШЭЎСКАЯ.

КРИМИНАЛ

Ранен сын одного из учредителей «Экомедсервиса»

Он сам открыл грабителям дверь.

Информацию о разбойном нападении на квартиру Владимира Каявы, сына председателя совета учредителей крупнейшего в стране медицинского центра "Экомедсервис", подтверждают в отделе информации и общественных связей ГУВД Мингорисполкома.

Согласно милицейским сводкам, молодой человек сам открыл дверь разбойникам. Под угрозой пистолета и ножа преступники связали скотчем его сожительницу, причинив хозяину квартиры проникающее ножевое ранение в грудь. Из квартиры воры успели вынести 2,5 миллиона белорусских рублей, ноутбук и куртку. Но далеко уйти им не удалось. Грабителей задержали прямо в подъезде. В соседней квартире сработала сигнализация, и к дому тут же прибыл наряд милиции Центрального отдела Департамента охраны.

По факту нападения возбуждено уголовное дело. Также в отношении одного из нападавших возбуждено уголовное дело за хранение пистолета.

Владимир Каява госпитализирован.

Сотрудники "Экомедсервиса" предполагают, что грабители неслучайно позвонили в дверь квартиры сына учредителя центра с белорусской стороны. Возможно, преступники знали, кто здесь живет, и надеялись поживиться. Но никто в центре не связывает криминальный инцидент с событиями, которые переживает "Экомедсервис" последние полгода. В медицинском центре сменилось руководство, должность генерального директора занял Сергей Щербаков.

Алеся КОВАЧ.

СПАДЧЫНА

Пад знос!

У Гродне знесены амаль цэлы гістарычны квартал на пачатку вуліцы Горкага, які раней называлі Залатой горкай і які з'яўляўся пераходам ад гістарычнай часткі горада да сучаснай. Будзе знесены і цагляны дом на рагу вуліц Горкага і 17 верасня, пабудаваны ў стылі канструктывізму.

Як паведаміў намеснік начальніка аддзела будаўніцтва і гарадской гаспадаркі Гродзенскага гарвыканкама **Вячаслаў КАРАВАЕЎ,** дамы былі знесены таму, што на гэтым участку плануецца пашырэнне дарогі, а таксама з-за свайго знешняга выгляду. Пакінулі толькі адзін дом, які абкладзены белай цэглай. Паводле слоў В.Караваева, ён не падлягае разбурэнню, бо добра выглядае.

На пытанне, што будзе на месцы знесеных дамоў, В.Караваеў адказаў, што не ведае і што пакуль там будзе газон.

Двухпавярховы цагляны будынак на рагу вуліц Горкага і 17 верасня, пабудаваны ў 1936 годзе, які таксама падлягае зносу, з'яўляецца адным з трох самых выдатных прадстаўнікоў канструктывізму ў Гродне. Дамы ў гэтым стылі пачалі будаваць на пачатку XX стагоддзя ў Заходняй Еўропе, і таму ў Гродне іх усяго некалькі, паведаміў БелаПАН гісторык Андрэй Вашкевіч.

На пачатку лета гродзенскія гісторыкі звярталіся ў гарвыканкам з просьбай пакінуць гэты дом, аднак атрымалі адмоўны адказ.

Алена СТОЦКАЯ.

СУД

К высшей мере?

В следственном изоляторе на ул.Володарского закончились слушания по уголовному делу гомельской банды Сергея Морозова — самой большой и кровавой банды за всю историю Беларуси. Гособвинение потребовало приговорить главарей к высшей мере наказания.

Как сообщили в ВС РБ, оглашение приговора по делу назначено на 1 декабря. За три месяца судье предстоит изучить более 150 томов и решить судьбу 46 обвиняемых. Именно поэтому и был взят такой длительный срок для вынесения приговора.

В Прокуратуре республики отказались пояснить свою позицию на слушаниях. Виктор Кононов, который поддерживал обвинение, лишь подтвердил, что во время прений была озвучена необходимость высшей меры наказания для некоторых обвиняемых. Но он отказался пояснить, к каким конкретно обвиняемым это относилось. "Я не могу этого говорить, пока не вынесен приговор, — сказал представитель гособвинения. — Придет время, и вы все узнаете".

То, что прокуратура будет настаивать на высшей мере для некоторых "морозовцев", было очевидно с самого начала процесса. По данным следствия, за бандой числятся более 30 убийств, а в Беларуси к "вышке" приговаривали и за меньшие прегрешения. За десять лет банда Сергея Морозова прибрала к рукам большую часть бизнеса города и района, в том числе крупные предприятия. На довольствии у бандитов состояли крупные чиновники из аппарата МВД, облисполкома и других государственных структур.

Как установили следователи, костяк банды сформировался еще в 1991—1992 годах. За первые два года Морозов подчинил себе практически все предпринимательские структуры города. В 1994 году черная касса банды насчитывала около миллиона долларов. Большие деньги позволили "морозовцам" продвигать наверх купленных ими чиновников. В 1997 году банда уже обросла связями в госаппарате на республиканском уровне. В самом Гомеле действия бандитов прикрывали офицеры МВД высшего уровня. Следствие располагает данными, что для прикрытия действий бандитов высокопоставленные сотрудники УВД области фальсифицировали уголовные дела, обвиняя в преступлениях невиновных людей.

В результате беспрецедентного по своим масштабам расследования деяний банды Морозова на скамье подсудимых оказались 46 человек. Помимо обвинений в 15 умышленных убийствах (уголовные дела еще по 15 убийствам выделены в отдельное производство, следствие по ним продолжается), изнасилованиях, вымогательстве, даче и получении взяток большинству обвиняемых инкриминируется также создание либо участие в преступной организации, то есть ст.285 УК РБ.

Георгий ДАНЬ.
ej.by

ФОТАФАКТ

Ачысцім горад ад бруду РНЕ

На выхадных у Гомелі адбылася акцыя "Ачысцім горад ад бруду РНЕ", падчас якой грамадскія актывісты ліквідавалі налепкі і афішы экстрэмісцкай арганізацыі, паведамляе HART.3DWAY.ORG.

Ідэя зладзіць падобнае мерапрыемства з'явілася з нагоды актывізацыі РНЕ ў горадзе. Так, у апошнія часы гамяльчане назіралі шматлікія налепкі і афішы дадзенай арганізацыі, расклееныя ў шматлюдных месцах.

Як паведаміў адзін з ініцыятараў акцыі, "такім чынам мы пазбавілі жыхароў нашага горада ад негатыўнага ўплыву гэтай фашысцкай арганізацыі. Справа ў тым, што РНЕ, чальцы якой спавядаюць неталерантнасць і нецярпімасць да іншых этнічных груп і культур, — чужародная з'ява для Беларусі".

ПАЛІТКУХНЯ

Стоп-сігнал

У сакратарыяце старшыні Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) Рэне ван дэр Ліндэна абверглі інфармацыю аб візіце ван дэр Ліндэна ў Мінск.

У той жа час амаль усе расійскія СМІ паведамілі, што кіраўнік ПАСЕ мае намер восенню наведаць Беларусь, каб сустрэцца з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. Таксама паведамлялася аб намеры еўрапейскага палітыка сустрэцца з прадстаўнікамі НГА, грамадзянскай супольнасці, палітычных партый, апазіцыйных рухаў.

У той жа час у сакратарыяце старшыні ПАСЕ паведамілі, што падрыхтоўка візіту ў Мінск дагэтуль не вялася. Падчас летняй сесіі ПАСЕ Рэне ван дэр Ліндэн выказаў гатоўнасць наведаць Беларусь восенню, магчыма, у верасні. Але ён заявіў аб тым, што прыедзе ў Мінск пры ўмове, што праграма яго візіту будзе ўзгоднена з беларускім бокам і будзе адпавядаць інтарэсам ПАСЕ.

Марына РАХЛЕЙ.

ВЫБАРЫ

Без другога тура?

Унесеныя ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі папраўкі ў Выбарчы кодэкс прадугледжваюць адмену другога тура галасавання па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Як паведаміў БелаПАН сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік, змяненні і дапаўненні ўносяцца з улікам вопыту правядзення мясцовых выбарчых кампаній. Інтарэс да мясцовых выбараў у насельніцтва значна ніжэй, чым да прэзідэнцкіх і парламенцкіх, а яўка выбаршчыкаў такая ж высокая — не менш за 50%, зазначыў ён. У другім туры галасавання актыўнасць насельніцтва ў выбарчай кампаніі зніжаецца яшчэ больш. Скасаванне другога тура галасавання, на думку распрацоўшчыкаў законапраекта, павінна зэканоміць дзяржаўныя сродкі на правядзенне мясцовых выбараў і спрасціць арганізацыйную працу па іх падрыхтоўцы і правядзенні. Да таго ж, паводле слоў сакратара ЦВК, *"практыка паказвае, што пераможца першага тура становіцца пераможцам і ў другім"*. Такім чынам, пераможцам на мясцовых выбарах будзе аб'яўлены кандыдат, які набярэ найбольшую колькасць галасоў у першым туры.

У сувязі з адменай другога тура галасавання ў Выбарчы кодэкс таксама ўносяцца адпаведныя папраўкі ва ўсе артыкулы, што рэгулююць дзейнасць выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў, патлумачыў М.Лазавік. Што тычыцца правоў суб'ектаў выбарчай кампаніі і назіральнікаў, гэтыя раздзелы Выбарчага заканадаўства, паводле слоў сакратара ЦВК, істотна не зменены.

Нагадаем, мясцовыя выбары мяркуецца правесці ў Беларусі 14 студзеня 2007 года. Сакратар Цэнтрвыбаркама не выключае, што новаўвядзенні будуць ухвалены Нацыянальным сходам яшчэ да афіцыйнага аб'яўлення выбараў.

Юрый ПАЦЁМКІН.

ПАРТЫІ

Штаб-кватэра пераехала ў Мар'іну Горку

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) прайшла перарэгістрацыю ў Міністэрстве юстыцыі. 1 верасня прадстаўнікі Мінюста ўручылі выконваючаму абавязкі кіраўніка спраў БСДП (Грамада) Анатолю Сідарэвічу пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 23.

Як паведаміў БелаПАН намеснік старшыні партыі Уладзімір Нісцюк, папраўкі ў статут БСДП (Грамада) былі ўнесены ў адпаведнасці з патрабаваннямі новай рэдакцыі Закона "Аб палітычных партыях". *"Гэта былі тэхнічныя, а не палітычныя змяненні, якія павінны да канца кастрычніка ўнесці ў свае статутныя дакументы ўсе палітычныя партыі. Калі б мы гэтага не зрабілі, то Мінюст меў бы права спачатку вынесці партыі папярэджанне, а потым паставіць пытанне аб яе ліквідацыі"*, — патлумачыў палітык.

Паводле слоў У.Нісцюка, у новай рэдакцыі статута таксама зменены юрыдычны адрас БСДП (Грамада). Цяпер штаб-кватэра партыі афіцыйна будзе знаходзіцца ў Мар'інай Горцы Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

Юрый ПАЦЁМКІН.

ПОСТФАКТУМ

Людмила ГРЯЗНОВА:

«Моя дочь учится не в Варшаве, а в Праге...»

*В позапрошлые выходные Белорусское телевидение распространило информацию о том, что дочь заместителя председателя Объединенной гражданской партии **Людмилы Грязновой** Светлана учится в Варшаве. В сюжете БТ также напомнило о том, что там же до недавнего времени учился и сын экс-кандидата в президенты Александра Милинкевича, которого недавно якобы выгнали из Варшавского университета...*

Как уже сообщалось в прессе, информацию о том, что сын Милинкевича напился и нахулиганил в Польше, за что его и исключили из польского вуза, первым распространил сайт Консервативно-Христианской партии — БНФ (КХП—БНФ), затем ее подхватило БТ.

Из стенограммы репортажа журналиста БТ **Юрия Прокопова:**

"Международный скандал с участием белорусской оппозиции: Витовта Милинкевича, сына экс-кандидата в президенты, выгнали из польского вуза за пьяный дебош. Как сообщает сайт Консервативно-Христианской партии — БНФ, Милинкевич-младший пил и грубиянил в Польше постоянно. Пикантность истории придает тот факт, что юного революционера родители пристроили на учебу за границу по специальной программе, которая финансируется из польского бюджета. В польском вузе оказался и сын супруги экс-кандидата Игорь Кулей. В Беларуси он прославился тем, что предоставлял в военкомат липовые справки о здоровье, чтобы "откосить" от армии. В Польше нарастает громкий политический скандал. Оказалось, что бюджетные деньги идут на содержание иностранных пьяниц и хулиганов. В лице последних выступают отдельные представители белорусской молодежи. По специальной программе польского правительства они приехали на учебу под видом политически репрессированных активистов оппозиции.

Как сообщает сайт Консервативно-Христианской партии — БНФ, в первые же дни "уцекачы" напились в общаге и подрались с поляками...

Среди "уцекачоў", пристроенных в польские вузы, оказались дети верхушки белорусской оппозиции. Например, Игорь Кулей, сын супруги экс-кандидата, отвечающей за подбор кадров для отправки за границу. В Беларуси Кулей-младший политикой не занимался, отметился разве что в военкомате с фальшивой справкой, чтобы "откосить" от армии."

Александр Милинкевич не опровергает, что его сын нарушил учебную дисциплину.

"Он не выполнил распоряжения воспитателя, пререкался с ним и пропустил одну экскурсию, посещение которой в рамках программы было обязательным, — сказал Милинкевич. — *Мой 17-летний сын Витовт стал участником этой программы, потому что был участником событий на площади, задерживался милицией и его отец сидел в тюрьме. Перед началом программы я просил польскую сторону, чтобы к белорусским студентам относились так же, как и к польским. Чтобы и учеба, и дисциплина были на уровне. И чтобы не было никаких поблажек моему сыну. И когда он туда ехал, я предупредил, что никаких скидок ему никто делать не будет. В соответствии с правилами, которые действуют для всех, он вместе с еще одним парнем был отчислен с курсов польского и английского языков. Никаких дебошей он не устраивал, и из программы его никто не исключал. Это ложь".*

Как пояснил "Народной воле" Александр Милинкевич, его сына исключили с языковых курсов, однако в программе имени Кастуся Калиновского он остался.

"Экзамен по языку Витовт будет сдавать экстерном", — говорит политик.

В материале на сайте КХП—БНФ было замечено, что вместе с пострадавшими от репрессий в Польшу отправились *"случайные люди"*, чему были удивлены даже польские чиновники.

Инна Кулей, которая возглавляет Комитет в защиту репрессированных, отвергает эти обвинения.

"Считаю, что это голословные обвинения", — не раз говорила она журналистам.

Людмила Грязнова, которая также входит в комитет защиты репрессированных от организации "Правозащитный альянс" (зарегистрирована в Вильнюсе), говорит, что отбор кандидатов на учебу в Польшу был очень тщательным.

"Я не знаю подробностей про сына Милинкевича, у меня нет никаких фактов, поэтому мне сложно говорить на эту тему, — объясняет Людмила Николаевна. — *Могу сказать, что на заседаниях Комитета в защиту репрессированных я провела немало времени. На отдельные заседания приходило до 30 человек. Каждому из желающих поехать учиться в Польшу мы уделяли по 10—15 минут. Поверьте, это была очень серьезная работа. На тех заседаниях, где я присутствовала, мы, как правило, из двадцати желающих 3—4 человека "отсеивали": они не подходили под критерии программы. Поэтому откуда набралось такое количество, как утверждает БТ, "левых людей", я не знаю. Вообще, для меня все это странно слышать. Все то, что сообщает БТ, нужно сверять и перепроверять. Иначе может получиться, как с моей дочерью: она учится не в Варшаве, как утверждает БТ, а в Праге. И учится там уже три года. И никакого отношения к этой програме она не имеет..."*

Для справки

Образовательная программа имени Кастуся Калиновского начала работать в июле 2006 года. Она создана для студентов, которые были исключены из белорусских вузов по политическим мотивам. Координирует деятельность этой программы супруга экс-кандидата в президенты А.Милинкевича Инна Кулей.

Марианна СВЕТЛАНИНА.

А где учатся ваши дети?

Анатолий ЛЕБЕДЬКО, лидер Объединенной гражданской партии:

— Мой сын учится в Белорусском государственном университете, на четвертом курсе. Не стану скрывать: были предложения отправить его на учебу за рубеж. Но для нас с женой более комфортно, когда сын рядом с нами — у нас один ребенок. Что касается сюжетов БТ на эту тему, то, я думаю, телевизионщики могли бы сделать неплохие репортажи о том, где учатся и работают дети некоторых чиновников... Но эти факты почему-то никто не смакует. Хотя я считаю, что самое главное, талантлив ребенок или нет, может он учиться за рубежом или нет. Но я не очень хорошо отношусь к тому, что много молодых белорусов сейчас уезжает на учебу за границу. Это явление не должно быть массовым. У нас в стране не так много активных людей...

Андрей КЛИМОВ, политик:

— Моя старшая дочь учится на третьем курсе Пражского экономического института. Другая дочь — в школе, а сын — в политехническом лицее.

Віктар ІВАШКЕВІЧ, намеснік старшыні Партыі БНФ:

— Мой сын вучыцца ў вышэйшай эканамічнай школе ў Празе. Справа ў тым, што пасля таго, як тут ліквідавалі "Беларускую маладзёжную", мая жонка-журналістка паехала па кантракце працаваць на Радыё Свабода ў Прагу. З ёй паехаў і сын. Там ён вучыўся ў школе, а потым працягнуў адукацыю.

Валерий ЩУКИН, правозащитник:

— Мои дети уже давно отучились. А внуки — еще нет. Трое из них получают среднее образование, четвертый поступил в ПТУ, пятый недавно закончил училище и начал работать. Две внучки уже несколько лет учатся в Чехии. Примечательно, что здесь они обе дважды не смогли поступить в белорусские вузы, а вот в Чехии вначале выучили язык, а затем без всяких поблажек сдали экзамены и поступили. Не скрою: им приходится тяжело, но они сами выбрали свой путь.

Олег МАНАЕВ, доктор наук, социолог:

— Мой старший сын уже давно отучился — ему 32-й год. А дочь учится на третьем курсе факультета философии и социальных наук БГУ. Первый и последний классы школы она заканчивала в Америке.

ДАРЭЧЫ

Супраць сына жонкі былога кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча Ігара Кулея ўзбуджана крымінальная справа па абвінавачванні ва ўхіленні ад службы ў арміі.

У Брэсцкім ваенкамаце "Інтэрфаксу" паведамілі, што Ігар Кулей прадставіў ім "фальшывую медыцынскую даведку аб нібыта атрыманай чэрапна-мазгавой траўме".

Як паведамляе прэс-служба Аляксандра Мілінкевіча, Ігар Кулей ужо чацвёрты год вучыцца ў Польшчы.

У ТЭМУ

«Тыя, хто робіць з дзяцей ворагаў народа, адкажуць за свае дзеянні перад законам»

"Пасля хвалі рэпрэсій у дачыненні да маіх калег і аднадумцаў улада пачала жорсткі прэсінг і запалохванне маіх родных", — такую заяву распаўсюдзіў 29 жніўня лідэр аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі, экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч.

Той факт, што "аб'ектамі пераследу" абраныя дзеці, сведчыць пра тое, што "дзеля дасягнення сваіх мэт улада не будзе грэбаваць ніякімі сродкамі", заяўляе Мілінкевіч. "Мэта гэтай вайны відавочная — максімальна абмежаваць маю палітычную дзейнасць, аказаць псіхалагічны ціск і дэмаралізаваць мяне і маіх калег па аб'яднаных дэмакратычных сілах", — лічыць палітык. На думку Мілінкевіча, такія дзеянні ўлад таксама сведчаць пра тое, што "акцыя салідарнасці, якую ініцыявалі аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, мае відавочны поспех". "Улада гэта ўсведамляе, таму ўсімі магчымымі спосабамі імкнецца перашкодзіць нашай салідарнасці", — гаворыцца ў заяве палітыка. "Беларусь, — лічыць Мілінкевіч, — абавязкова дачакаецца часу, калі тыя, хто робіць з дзяцей "ворагаў народа", адкажуць за свае дзеянні перад законам".

ДЕМОКРАТИЯ ПО-БЕЛОРУССКИ

Минюст советуется с помощником Лукашенко по идеологии

Полтора месяца лежат в Министерстве юстиции документы на регистрацию общественного объединения белорусских пенсионеров «Старейшины»

Неизвестно, получат ли "Старейшины" ответ и в сентябре. На прошлой неделе руководителю инициативной группы по созданию общественного объединения **Владимиру РОМАНОВСКОМУ** пояснили в министерстве, что, прежде чем зарегистрировать то или иное общественное объединение, Минюст обязан ознакомиться с решением специальной комиссии, которую возглавляет начальник главного идеологического управления Администрации президента **Олег ПРОЛЕСКОВСКИЙ**, и в состав которой входят депутаты Палаты представителей. Проще говоря, целесообразность появления в стране негосударственной структуры решают чиновники, работающие на идеологической ниве.

— Действия данной комиссии законодательно никак не регламентированы, — говорит Владимир Романовский. — Тем не менее регистрация всех общественных объединений проходит по таким правилам.

Когда мы попытались высказать свои претензии начальнику управления Минюста, он в ответ лишь пожал плечами. Мол, от нас ничего не зависит. Получается, что де-юро решение принимает Министерство юстиции, но де-факто — специальная комиссия. Причем, когда я поинтересовался, что именно проверяет комиссия — идеологическую направленность объединения, что-то другое, ответа так и не получил. Мне сказали, что на заседание комиссии приглашают представителей объединения, подавших заявку на регистрацию.

— А по закону, сколько времени Минюст может рассматривать вопрос о регистрации общественного объединения?

— 30 дней.

— Выходит, вы опять зависли...

— Это уж точно. Идея создания в Беларуси общественной организации пенсионеров родилась еще в мае прошлого года. И до сих пор мы не можем реализовать ее в жизнь. Сначала долго не могли решить вопрос с юридическим адресом. Пришлось дважды проводить учредительное собрание. Теперь, когда с документами все в порядке, Минюст (*читай — Администрация президента*) затягивает с регистрацией.

— Эти трудности не сказались на оргработе по созданию объединения. Число Ваших сторонников не уменьшилось?

— Нет, что вы. Наши люди все понимают, тем более принципиальность вопроса регистрации. В каждой области уже практически созданы подразделения нашего общественного объединения. Но они не могут включиться в работу только потому, что оно не зарегистрировано.

Нам не хочется пока делать громких заявлений, предпринимать какие-то шаги, потому что есть надежда на положительный ответ Минюста.

— Вы верите, что объединению, учредителями которого являются Валерий Щукин, Зинаида Бондаренко, Гарри Погоняйло и другие известные белорусы, резко критикующие действующую власть, разрешат легально существовать?

— Цивилизованное государство должно быть заинтересовано в том, чтобы структурировать в том числе и 2,5 миллиона пенсионеров. Основная цель нашей организации — улучшить социальное положение пенсионеров, отстаивать их права и интересы. Мы не политическое объединение, не политическая партия.

Но, на мой взгляд, наша власть действительно очень опасается, что наше объединение будет достаточно самостоятельной организацией, неуправляемой. Поэтому в свое время нашу инициативу в штыки принял и Республиканский союз ветеранов.

— К слову, чем закончился тот конфликт? Или он еще продолжается?

— Мы попытались их убедить, что негоже рвать друг другу седые бороды. Сейчас мы поддерживаем отношения с членами Совета, с ветеранскими организациями. Ведь по сути делить нам нечего.

У данной организации есть ограничения: членами Совета могут быть люди, трудовой стаж которых не менее 30 лет. Мы же ориентируемся только на возрастной показатель, мы будем защищать права, в том числе и пенсионеров, которые никогда не работали.

— Сколько пенсионеров пожелали вступить в ваше объединение?

— Если судить по заявкам, то это уже порядка тысячи человек. Думаю, что когда организация будет зарегистрирована, число их увеличится. Но мы не стремимся раздувать численность объединения до миллиона человек. Наша задача — обеспечить структурирование такого социального слоя, как пенсионеры, создать независимые организации по интересам. А вот курировать их работу, разрабатывать инициативы будет наше общественное объединение.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

Почему Министерство юстиции тянет с регистрацией общественного объединения?

— с таким вопросом мы обратились к некоторым учредителям общественного объединения "Старейшины".

Зинаида БОНДАРЕНКО, народная артистка Беларуси:

— Тут и комментировать нечего. Все понятно. Мы — альтернатива Союзу ветеранов, которую возглавляет всем известный генерал Новиков. Власть боится нашего влияния на пенсионеров. Вдруг мы развернемся, вдруг к нам потянутся люди!

Я сразу говорила, что нас не зарегистрируют. Эта ситуация из разряда тех, которые сейчас переживают Союз писателей Беларуси, Партия коммунистов Белорусская. Власть ищет поводы, чтобы лишить их регистрации. Союз писателей выселили из здания, лишив тем самым юридического адреса. В июле коммунистов-калякинцев пытались "воссоединить" с провластной Коммунистической партией Беларуси, но у них ничего не получилось. И вот недавно читаю, что Минюст вынес предупреждение ПКБ.

Совсем печальные времена наступили в Беларуси.

Валерий ЩУКИН, правозащитник:

— Властям нужны только те общественные организации, которые они создают сами. Любой самостоятельной структуре, управлять которой явно затруднительно, они ставят палки в колеса. Нашему оргкомитету потребовался год, чтобы собрать необходимые документы для регистрации! И теперь, когда придраться вроде бы не к чему, они просто тянут время.

Я даже не могу предположить, каков будет конечный результат. Зарегистрируют нас или нет. Минюст с некоторых пор ничего не решает, выполняет канцелярские функции. Все решает комиссия во главе с главным идеологом страны.

Но общественное объединение пенсионеров, которое мы учредили и хотим зарегистрировать, — не политическая организация. Цели, которые мы ставим, — лоббирование интересов пенсионеров (большая часть из которых не является ветеранами войны и труда) через депутатов всех уровней.

Ольга ЗАВАДСКАЯ, мать без вести пропавшего оператора ОРТ Дмитрия Завадского:

— А зачем государству лишняя головная боль? Власть панически боится, что новая структура объединит пенсионеров и станет в оппозицию к нынешнему руководству страны. Боится, что люди станут защищать свои права, права и интересы других пенсионеров, и тогда у многих сторонников режима откроются глаза.

Зарегистрируют ли в конечном итоге наше объединение? Оптимизма на этот счет у меня нет. Но работа проводится, мы не отступим.

АКТУАЛЬНА!

Што там, на палетках?

З такім пытаннем мы звярнуліся да намесніка кіраўніка галоўнага ўпраўлення расліна-водства Мінсельгаса **Віктара Раманавіча КОРНЕВА.** Яно цікавіць многіх, бо ўборка ўраджаю сёлета зацягнулася, збожжавыя амаль штодня "малоцяць" дажджы.

Наш субяседнік паведаміў: нягледзячы на звышцяжкія ўмовы, Брэстчына, Гомельшчына і Гродзеншчына практычна закончылі гэтую работу. На Магілёўшчыне і Віцебшчыне засталося каля 10 працэнтаў плошчаў, збожжавыя на якіх не абмалочаны.

На апошнія дні было намалочана каля 6 мільёнаў тон збожжа, ураджайнасць у межах 29 цэнтнераў з гектара.

"Сёлета хлеба было б болей, чым летась, калі б не падвяло надвор'е", — падкрэсліў Віктар Раманавіч.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

СЛЫШАЛИ?

С повышением повремените...

Ставка I разряда до ноября повышаться не будет, хотя ожидалось, что она станет больше уже с 1 сентября.

Официальные лица не сообщают, с чем это связано, но очевидно, что не с богатством белорусского бюджета.

Напомним, что в последний раз оплата труда работников бюджетной сферы повышалась достаточно давно — 1 февраля.

www.belaruspartisan.org

Народная Воля
8 ВЕРАСНЯ 2006 г.

КОРОТКО

Драка в Кондопоге

В карельском городе Кондопога произошли массовые беспорядки. В нескольких районах города были устроены погромы, направленные против выходцев с Кавказа, позже жители города собрались на митинг, потребовав от властей удалить кавказцев из города. Практически все выходцы с Кавказа были вынуждены покинуть город. Около 200 человек временно переехали в Петрозаводск.

Эта драка вызвала широкий резонанс. "Конфликт в одном из самых спокойных северных регионов означает, что проблема межнациональной розни приобрела в России системный характер", — пишет газета "Ведомости". В целом российская пресса обсуждает две версии событий: власти могут использовать подобные события для укрепления своих позиций, а националисты — для возможного прихода к власти. Сами пострадавшие говорят, что у беспорядков были экономические причины — криминальные авторитеты использовали народное недовольство, чтобы вытеснить кавказский бизнес из города. Эксперты считают, что участившиеся случаи таких конфликтов в регионах превращаются в проблему государственного масштаба и федеральная власть рискует утратить контроль над ситуацией.

Меркель отобрала у Райс титул самой влиятельной женщины в мире

Федеральный канцлер Германии Ангела Меркель возглавила список ста самых влиятельных женщин в мире, ежегодно составляемый американским журналом Forbes, сообщает AFP.

Рейтинг составляется в третий раз. Предыдущие два раза его вполне предсказуемо возглавляла госсекретарь США Кондолиза Райс. На этот раз она заняла второе место в списке. Тройку лидеров рейтинга замыкает вице-премьер и министр здравоохранения Китая У И, в прошлом году занявшая второе место.

Заметим, что у сенатора Хиллари Клинтон лишь 18-е место, у первой леди США Лоры Буш — 43-е место, у королевы Великобритании Елизаветы II — 46-е и у президента Латвии Вайры Вике-Фрейберги —63-е место.

Бесплатный Интернет

Норидж на востоке Англии стал первым городом в Великобритании, предоставляющим бесплатный доступ в Интернет по беспроводным каналам. По всему городу установлено более 200 антенн, обеспечивающих полное покрытие в трех районах и в центре Нориджа.

Точки доступа есть не только на улицах, но и в здании мэрии, библиотеках и в университете.

Китайские пираты захватили почти половину внутреннего рынка

Как сообщает китайское информационное агентство "Синьхуа", согласно опросу, пиратская продукция в таких областях, как книги, компакт-диски с записями фильмов и музыки, а также программного обеспечения, составили в прошлом году в Китае 45,5 процента всего внутреннего оборота.

Засняли рождение звезды

Впервые в истории астрономам удалось запечатлеть процесс взрыва Сверхновой звезды.

Уникальные фотокадры из глубин космоса опубликовал американский научный журнал "Нэйче" (Nature). Мощнейший выброс гамма-излучения зафиксирован в созвездии Овна на расстоянии 440 миллионов световых лет от Земли.

В течение получаса взорвавшаяся звезда выделила количество энергии, которое наше Солнце излучает за миллиард лет. Вспышка была настолько яркой, что в объективах телескопов на несколько мгновений померк весь Млечный Путь. Сияние Сверхновой можно будет наблюдать еще несколько столетий, сообщает НТВ.

О ГЛАВНОМ

Чьи интересы видны в зеркале ливанской трагедии?

В чем же все-таки причины израильско-ливанской войны? Из-за чего пролито столько крови? Пишут и говорят обо всем, но только не об этом. Сообщали об обстрелах, убитых и раненых, о разрушениях и поездках в зону конфликта политиков... Теперь вот о миротворческой миссии. А из-за чего такие страдания ливанского народа? Трудно поверить, что причиной всему взятие в плен двух израильских солдат. Скорее это лишь повод. Может, "Народная воля" расскажет об этом?

Георгий МАКАЕВ, г.Минск.

Читатель прав. Давайте поищем ответы на главные вопросы. Послушаем политиков и аналитиков.

По оценке представителя иранской компании, на возведение объекта понадобится от 4 до 5 лет. Сейчас иранцы готовят бизнес-план. В самое ближайшее время компания начнет переговоры с потенциальными разработчиками архитектурного проекта: месторасположение отеля создает дополнительные требования к его внешнему виду. М.Снямак уверен, что с подрядчиками проблем не возникнет: *"Мы будем опираться на местные компании, которые имеют богатый опыт строительства и умеют быстро строить"*. Не будет, по его мнению, и проблем с финансированием. *"Финансовые вопросы уже решены"*, — подытожил М.Снямак.

Проект Keyson и "Трастбанка" интересен еще и тем, что для управления новой гостиницей заказчик предполагает привлечь известную мировую гостиничную сеть. Представитель компании Keyson Махинрад Снямак поделился этими планами.

"Мы являемся инвестором и строителем, а для эксплуатации гостиницы хотели бы привлечь известного международного гостиничного оператора с именем, к примеру, Hayatt или Hilton. Мы будем вести переговоры с заинтересованными сетями. У нашей компании есть офисы в Париже и Лондоне, и когда заходит речь о международных проектах, они всегда подключают к переговорам известных участников гостиничного рынка. Конечно, оператором нашей гостиницы может стать и белорусская компания. Но я считаю, что для проекта важно участие известного мирового брэнда. Это даст дополнительный плюс: если есть гостиница с именем, гости заранее знают, что их ждет".

Вадим СЕХОВИЧ.
ej.by

РЭГІЁН

Ці стане Сураж беларускім Кландайкам?

Змяніць да лепшага эканоміку Віцебшчыны і ўсёй Беларусі, магчыма, дапаможа пакуль што гіпатэтычнае радовішча нафты ва ўсходняй частцы Віцебскага раёна, ля малапрыкметнага мястэчка Сураж. Тут ужо каля двух год марудна, але настойліва ідзе пошук нафты, якой так бракуе Беларусі для эканамічнай незалежнасці ад Расіі.

Прамысловая здабыча нафты ў нашай краіне (тады яшчэ — БССР) распачалася ў 1965 годзе, калі ў Прыпяцкім рэгіёне было знойдзена радовішча, абавязанае сваім існаваннем дэвонскім і верхнепратэразойскім адкладанням вуглевадародаў. Пік асваення гэтых крыніц нафты прыпаў на 1975 год, пасля чаго залежы каштоўнай сыравіны сталі хутка бяднець. Цяпер у Прыпяцкім краі здабываецца не больш за 1,8 мільёна тон у год з усіх 69 свідравін. Такая колькасць не можа ісці ні ў якое параўнанне са здабычай нафты ў Расіі або іншых краінах былога СССР. Але гады з 2 таму беларускія геолагі і геафізікі правялі пошук непадалёку ад мястэчка Сураж, што ў Віцебскім раёне, і прыйшлі да высновы: тут можа знаходзіцца перспектыўнае радовішча нафты. На гэтую думку наводзіла тое, што праз Суражскі рэгіён пралягае Аршанскае прадонне, дзе ў свой час былі зафіксаваны пароды дэвонскага перыяду, звычайна багатыя на вуглевадароды.

Меркаваннем навукоўцаў зацікавілася ўлада. На бюджэтныя грошы з Уфы прывезлі унікальную для Беларусі свідравальную ўстаноўку, і брыгада вельмі дасведчаных свідравальшчыкаў пачала даследаванне нетраў каля Суража. Пакрысе рабочыя прасунуліся на глыбіню каля тысячы метраў, але безвынікова.

— Пра канкрэтны вынік можна будзе меркаваць тады, — гаворыць начальнік аддзела Камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віцебскага аблвыканкама Алег Міхневіч, — калі глыбіня свідравіны дасягне 1,5—1,6 км. Да такой адзнакі яшчэ ёсць рэзерв, бо максімальная глыбіня, на якую здольная набытая ў Бураціі ўстаноўка, — 2,1 км. Так што пачакаем.

Тым больш што прагноз аптымістычны. Пра цалкам верагодную наяўнасць нафты гавораць і слынныя знаўцы геалогіі, і ветэраны нафтаздабычы ў Расіі і Беларусі.

Свідраванне зямлі ля Суража працягваецца. Праўда, з кожным днём усё больш павольна, што зразумела, бо чым глыбей свідравіна, тым цяжэй далейшае свідраванне. Сёлета яно ўжо ідзе не метрамі, а сантыметрамі за суткі. Відаць, спатрэбіцца яшчэ не менш за год, каб пачуць адказ на пытанне, ці стане Сураж беларускім Кландайкам у сэнсе паваротнага пункту ў гісторыі эканомікі. Хацелася б, канечне, верыць у цуд, але тая ж гісторыя і звычайны жыццёвы досвед падказваюць, што ў эканоміцы цудаў не бывае. Так што давядзецца нам і надалей карыстацца чужой нафтай, з-за якой незалежнасць Беларусі знаходзіцца ў вельмі хісткім стане. Бо ўсім вядома, што палітыка грунтуецца на эканоміцы, а не наадварот. Ну а марыць пра выратавальную дэвонскую нафту на Віцебшчыне забараніць нельга. Асабліва, калі гэтыя летуценні суцяшаюць душу і сілкуюць аптымізм.

Так што свідруйце, хлопцы, свідруйце!

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ГЛЫБІНКА

Як у фільме жахаў...

Вёска насіла прыгожую назву — Каралінова. Чыгунка, якая вядзе з Мінска ў Гродна, падзяляла яе на дзве часткі. У адной быў цагельны завод, у другой — школа. Спачатку сямігодка, потым дзеці вучыліся тут па восем гадоў. Школа месцілася ў былым панскім доме з калонамі, мансардай. Потым паабапал гэтага будынка ўзвялі яшчэ два. Злева быў невялічкі буфет і класны пакой, справа — сталярная майстэрня і таксама класны пакой. Да школы вяла алея стогадовых магутных ліпаў. Імі была абсаджана і вуліца ўздоўж чыгункі.

Калі прыйшлі Саветы, пан Сіняўскі ўцёк ад згубы за мяжу. Палі наўкола маёнтка нават пры калгасах доўга звалі Сіняўшчынай.

І настаўнікі, і дзеці любілі школу і падтрымлівалі ў ёй чысціню і парадак. Перад галоўным будынкам быў вялікі кветнік — круглы, як сонейка, з прыгожымі рознакаляровымі кветкамі. За будынкам — стары, яшчэ панскі сад і доследны ўчастак, на якім расло ўсё, што толькі магло расці ў гэтай мясцовасці. Кожны вучань старэйшых класаў меў сваю градку, якую палоў і даглядаў усю вясну і лета. А восенню было свята ўраджаю, і той, хто вырасціў самыя вялікія буракі, гарбузы, моркву і іншыя культуры, атрымліваў прызы. Мы, вясковыя дзеці, звыклыя да работы, вельмі стараліся. Памятаю, аднойчы буракі на маёй градцы ўзышлі дзе-нідзе, бо, мабыць, было дрэннае насенне. Я была ў роспачы. Прыбегла са слязамі да старэйшай стрыечнай сястры, якая ўжо мела сваю сям'ю:

— Гэля, мая градка амаль пустая... — прамовіла скрозь слёзы.

— Не плач. Я неўзабаве буду прарываць свае буракі, бо ўзышлі вельмі густа. Ты занясеш і пасадзіш. Палівай, пакуль не прымуцца. Убачыш восенню, які ўраджай будзе!

Так яно і сталася: восенню я вельмі ганарылася сваёй працай.

Быў пры школе яшчэ адзін сад — малады. Яго мы садзілі самі. З якой любоўю палівалі дрэўцы, каб прыжыліся, як радаваліся вясной першым лісточкам, першаму цвету! А кожную восень старанна абвязвалі ўсе яблынькі яловымі лапкамі, каб зайцы не пашкодзілі кару.

У Каралінаўскай школе вучылася шмат таленавітых дзяцей. Тарэза Адамовіч не ведала ніякай другой адзнакі, акрамя пяцёркі. Яна скончыла БДУ, аспірантуру ў Маскве, стала вучоным. Вячаслаў Трыпуцька быў марскім афіцэрам, служыў на Балтыйскім флоце. Ірына Краскоўская стала высакакласным спецыялістам у галіне парашковай металургіі. Ды ўсіх і не пералічыш.

Я ведала, што ў Каралінове школа ўжо не працуе, але нават у страшным сне не магла прысніць, што сталася з тымі дарагімі сэрцу мясцінамі. А калі ўбачыла — жахнулася. Быльнёг вышэй чалавечага росту, кустоўе раскашуецца там, дзе некалі цвілі кветкі. Здзічэў сад. Будынкі, што ўзводзіліся пазней, разабралі, галоўны — былы дом пана Сіняўскага, стаіць, як прывід з фільма жахаў. Дзверы згнілі і вываліліся, павывальваліся вокны, адна калона згніла і ўпала, а мансарда ледзь трымаецца на другой. Толькі старыя ліпы, нібы жабрачкі на цвінтары, млеючы ад спёкі, засмяглымі лістамі шэпчуць жалобную малітву. Аб памерлай школе, аб памерлай прыгожай вёсцы Каралінова, аб ненароджаных дзецях, што ніколі не прыйдуць у гэтую школу. Усё разрушылася і загінула. Без вайны.

Вярнуўшыся з Каралінова ў вялікай жалобе, нібы з пахавання дарагога чалавека, у сваю родную вёску Рагалёўшчына, я сказала швагру Раману Страшкевічу:

— Схаджу ў Гуту.

— Туды і дарога ўжо зарасла. Вымерла Гута...

Вымерла Гута?! Маляўнічая вёсачка ля лесу, дзе на кожнай сядзібе раслі сады, дзе мяне, малую сірату, так ласкава прывячалі ў сем'ях маіх сябровак? Як жа так сталася, што вымяраюць нашы вёскі, што ў роднай Рагалёўшчыне жыццё цепліцца ў нямногіх хатах? Усе перасяліліся. Толькі не ў аграгарадок, а на Вішнеўскія могілкі. Прычым многія заўчасна. Як кажуць, жыць бы ды жыць. Але не жылося...

У навакольных Зацішку, Юкавічах, Войштавічах год ад году пусцеюць хаты. Міне якіх гадоў дзесяць, і на вясковых вуліцах не будзе з кім павітацца. Усё зарасце быльнягом, як у Каралінове. Толькі памяць застанецца ў сэрцах тых, каму гэтыя мясціны дарагія з дзяцінства. Яна будзе жыць, пакуль будзем жыць мы.

...У доме маёй стрыечнай сястры Яніны Мядведнікавай з Рагалёўшчыны стаіць вялікі драўляны крыж, у шафе ляжыць памытая і адпрасаваная комжа. Па каталіцкім веравызнанні яна знаходзіцца ў той хаце, з якой нядаўна праводзілі чалавека на вечны спачын. У сястры раптоўна памёр муж, якому было шэсцьдзесят гадоў. Паехаў у млын і не вярнуўся. Крыж і комжа будуць у Яніны да таго часу, пакуль у вёсцы зноў хто-небудзь не памрэ. Тады нехта з тутэйшых вясковых мужчын, якіх у Рагалёўшчыне па пальцах можна пералічыць, апране комжу, возьме крыж... А надыдзе такі час, што не будзе каму і труну вынесці, і яму выкапаць, і крыж несці.

Мне некалі здавалася страшным, што гарады праглынаюць вёскі, як у фільме "Белыя росы". Была вуліца, хаты, і раптам усё змянілася. Аказваецца, не гэта самае страшнае. Куды страшней, калі цэлыя вёскі нібыта праглынуў нябачны монстр, які загубіў Каралінова, Гуту і дзесяткі вёсак і вёсачак па ўсёй нашай Беларусі. Божа літасцівы, спыні яго! Бо калі справа так пойдзе і далей, то не адратуюць нас і аграгарадкі. А каб такога не здарылася, трэба вярнуць людзей у сельскую мясцовасць. Хаця б тых, у каго тут карані. Зацікавіць не толькі дыхтоўным жыллём, але і высокім заробкам, годнымі ўмовамі жыцця.

Пакуль яшчэ не позна.

Элеанора КУНЦЭВІЧ.

Валожынскі раён.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

У берега живых

Это просто удивительно — как ясно чувствовал он свою смерть. Еще задолго до нее. Жизнелюб и оптимист, автор шести книг чудесных стихотворений, талантливый художник и не менее талантливый артист...

Евгений Матвеев сорок лет отработал врачом в санатории "Новоельня" Дятловского района. Лечил людей от туберкулеза. И врачевал их души стихами, скульптурами из дерева, сценическими образами.

Он сгорел как свечка. За два месяца. Жена Нила Ивановна и сын Олег Евгеньевич, тоже врачи, на свои деньги издали еще один сборник его стихов. В память об этом замечательном человеке. Называется он "У берега живых".

Евгений Матвеев родился на Псковщине, закончил Минский медицинский институт. Он искренне любил Беларусь и считал ее своей второй родиной, отдал ей свои талант, ум и душу.

Извини, дорогой читатель, я немножко отвлеклась. Хочу опять сказать о том, как автор чувствовал приближение смерти. Вот что он писал в одном из своих стихотворений:

Последнее глухое одиночество:
Вокруг пустыня, сколько ни кричи.
С болезнями,
с моей тоской-пророчицей
Мне жутко в этой аспидной ночи.
Кто рядом был,
в закатном зыбком мареве
Исчезли, превратившись в миражи.
Так отчего ж мы
в отпылавшем зареве
Еще горим, душа моя, скажи?



Завершает сборник стихотворение под названием "Я — краснотал".

Меня свалить не раз пытались,
И столько ж раз я прорастал.
Теперь и пня нет, но остались
Клочки корней. Я — краснотал!
Пусть изувечен я и болен,
А позади немало лет —
У каждой почки к жизни воля,
На каждой ветке крови след.
За всякий светлый миг бороться
Природа-мать душе велит!
Я по весне, почуяв солнце,
Пробьюсь побегом из земли...

Он похоронен на Новоельненском кладбище. На могиле всегда свежие цветы, которые приносят любящие жена и сын. Поклониться Евгению Алексеевичу приходят жители района, поселка, все, кто его знал, кто восхищался и восхищается творчеством этого талантливого человека.

Евгений Матвеев взял эпиграфом к книге "У берега живых" собственные строки:

И, уходя, оставить за собою
Не пепел, а Вселенную любви.

Это было его жизненным девизом. Этот девиз он оставил всем нам.

Леонарда ЮРГИЛЕВИЧ.

Дятловский район.

ШОУ-БІЗНЕС

Канцэрт на ўзлётнай паласе

*Такога ў Беларусі яшчэ не было. На ўзлётнай паласе аэрапорта "Мінск-1" адбыўся грандыёзны рок-канцэрт **"Estrella star show"**. У ім, акрамя беларускіх музыкантаў, узялі ўдзел папулярныя расійскія гурты **"Ума2рман"** і **"Горад 312"**. Каронным нумарам праграмы было выступленне сусветна вядомага калектыву са Швецыі **"The Cardigans"**.*



Уладзімір Пугач не ўжывае піва з чыпсамі

"Мы планавалі, што канцэрт "Estrella star show" павінен стаць фэстам, якіх яшчэ не бачыў не толькі Мінск, але і краіна. Арганізаваць канцэрт на стадыёне "Дынама" можна было без праблем. Але гэта б выглядала даволі шэрагова. Шчыра кажучы, нам патрэбны быў пафас. Выбраўшы ў якасці канцэртнай пляцоўкі ўзлётную паласу аэрапорта, мы дасягнулі гэтага", — адзначыў на прэс-канферэнцыі каардынатар праекта, прадстаўнік маскоўскага прадзюсерскага цэнтра **Аляксей Русак**.

Варта адзначыць, што дзеля правядзення рок-фэста арганізатары змаглі дамовіцца з беларускімі авіятарамі аб пераносе некалькіх авіярэйсаў з аэрапорта "Мінск-1" у аэрапорт "Мінск-2".

Кошт на квіткі па беларускіх мерках быў прыстойным — ад 15 да 250 тысяч рублёў. Тыя, хто набыў самыя дарагія квіткі, у адрозненне ад астатніх знаходзіліся ў больш выйгрышным становішчы. Для іх была створана VIP-зона, дзе стаялі пластыкавыя крэслы. Увогуле арганізацыя "Estrella star show уразіла сваёй зладжанасцю. Нават празмерная колькасць супрацоўнікаў міліцыі была дарэчы, бо гледачоў набралася даволі шмат — па прыкідках арганізатараў, іх было 7—8 тысяч. Для таго, каб патрапіць у свой сектар лётнага поля, гледачам было неабходна пераадолець тры міліцэйскія кардоны. Асабістыя рэчы загадана было здаваць у камеры хавання.

Адзінае, што бянтэжыла некаторых прыхільнікаў року, — гэта нястача піва ў бліжэйшых да аэрапорта крамах. Як патлумачылі супрацоўнікі міліцыі, згодна з дзеючым заканадаўствам, продаж піва ў радыусе пяцісот метраў ад правядзення забаўляльных мерапрыемстваў забаронены. Падчас канцэрта на лётным полі спіртнога не прадавалі. Асартымент гандлёвых палаткаў быў прадказальным — салодкая вата, попкорн і чыпсы "Эстрэлла". Чэргі былі ўнушальныя, але музыкантаў у іх заўважана не было...

Дарэчы, як прызнаўся саліст J-морса Уладзімір Пугач, піва з чыпсамі ён не ўжывае...

Крам у раёне аэрапорта шмат, і таму тыя, хто хацеў перад канцэртам заправіцца півам, гэта зрабілі. Яркуючы па доўгіх чэргах у біятуалеты.

Кыргызскія спевы на беларускай зямлі

Удзельнікі канцэрта пачалі прыбываць у аэрапорт "Мінск-1" яшчэ днём. Першым да журналістаў выйшаў адзін з удзельнікаў гурта "Ума2рман" Сяргей Крыстофскі: *"Уладзімір (яшчэ адзін удзельнік гурта і брат Сяргея". — **Аўт.**) адпачывае з дарогі. Таму за "Ума2рман" аддувацца буду я адзін".* Дарэчы, Сяргей, бадай, адзін з першых артыстаў, які смела заявіў у вочы беларускім акулам пяра і мікрафона, што Мінск яго ўразіў не вельмі: *"Как вы тут живете? На мой взгляд, очень душный город, даже Москва не такая душная..."*

Пра беларускіх выканаўцаў Сяргей Крыстоўскі ведае няшмат: *"Сярога — беларус, "Ляпісы", па-мойму, таксама вашыя, больш нікога з беларусаў не ведаю".* Гэтая фраза, здаецца, і ёсць паказчык таго, чаго варты беларускі шоу-бізнес...

Увогуле, шлях да ўсенароднай любові і папулярнасці для гурта "Ума2рман" быў няпростым: *"Мы з братам распачыналі граць паасобку. Потым вырашылі аб'яднаць намаганні. Гэта зараз у нас усё добра, а былі часы, калі на нашых песнях радыйшчыкі ставілі крыж — "нефармат" і ўсё тут. У той момант галоўным было не апусціць рукі і цярпець... Прадухіляючы наступнае пытанне, скажу, што папулярнасць не стамляе — папросту гэта частка нашай прафесіі".*

Следам за "Ума2рман" да журналістаў у поўным складзе выйшаў "Горад 312". Гісторыя гурта распачыналася ў Кіргізіі, а дакладней, у Бішкеку. Лічбы "312" якраз і азначаюць тэлефонны код Бішкека. Салістка гурта Ая (у жыцці Святлана Леснікава. — **Аўт.**) распачынала спяваць у Кіргізіі ў гурце "Аян". Вакалу яна навучылася ў прыватнай школе. Голас у дзяўчыны, што называецца, дай Бог кожнаму... Свае вакальныя даныя Ая прадэманстравала і ў імпраізаваным прэс-цэнтры, заспяваўшы па-кыргызску.

Пасля таго як гурт стаў вельмі папулярным на радзіме, было прынята рашэнне "штурмаваць" Маскву. І варта сказаць, што Масква пакарылася даволі хутка: *"Масква — гэта адпраўная кропка. Гэта горад з вялікімі магчымасцямі. Таму штуршок для нашай папулярнасці дала менавіта расійская сталіца",* — прызналася Ая. Ужо каторы месяц запар песня "Останусь" карысталася шырокай папулярнасцю на ўсемагчымых FM-станцыях. Дарэчы, у апошнім альбоме гурта, які называецца "Вне зоны доступа" ёсць і песня на беларускай мове: *"Нас многае звязвае з Беларуссю. Перад "Славянскім базарам" мы рэпеціравалі разам з аркестрам Міхаіла Фінберга. А яшчэ тут у мяне жыве брат, таму кожны раз з ахвотай прыязджаю ў вашую краіну",* — прызналася салістка "Горада-312".

Пра гісторыю з'яўлення беларускамоўнай песні на кружэлцы "Горада-312" аўтар гэтых радкоў, без лішняй сціпласці, ведае лепш за іншых. З творчасцю "Горада-312" мне давялося пазнаёміцца некалькі гадоў таму ў Маскве. Тады на абсягах расійскай сталіцы гурт ведалі, аднак да суперхітоў "Останусь" і "Вне зоны доступа" час яшчэ заставаўся. Па просьбе беларускіх прыхільнікаў "Горада-312", якія жывуць у Маскве, я напісаў некалькі беларускіх перакладаў песень. Музыкантам спадабалася "Вясна". Яе прэм'ера адбылася восенню мінулага года ў маскоўскім клубе "Вернэль". Тады салістка гурта Ая вельмі перажывала за правільнасць вымаўлення, аднак для чалавека, які раней не сутыкаўся з беларускай мовай, "Вясна" ў яе выкананні прагучала даволі прыстойна. Крыху пазней песня з'явілася на дыску. Дарэчы, беларускамоўная "Вясна" прадаецца на дысках толькі на тэрыторыі нашай краіны.

Аднак на канцэрце Estrella star show беларуская песня так і не прагучала: *"Арганізатары адвялі нам вельмі мала часу. Да таго ж беларускі гурт, які выступаў перад намі (J-Морс), крыху перабраў з часам, а мы спазняліся на цягнік, таму і заспявалі толькі пяць песень. Аднак нашы прыхільнікі могуць не перажываць, у хуткім часе мы прыедзем у Беларусь з паўнавартасным сольным канцэртам",* — расказалі ўдзельнікі гурта.

«The Cardigans»: «Жыве Беларусь!»

Самымі на першы погляд капрызнымі музыкантамі, якія бралі ўдзел у фэсце, маглі паказацца ўдзельнікі шведскага гурта "The Cardigans". Перад іх прэс-канферэнцыяй журналісты прайшлі падрабязны інструктаж: *"Мабільнікі адключыць, з успышкамі не фатаграфаваць, асабістых пытанняў не задаваць, іначай прэс-канферэнцыя адразу ж скончыцца...".* Нягледзячы на тое, што ўсе гэтыя правілы былі ў той ці іншай ступені парушаны, шведскія музыканты адказалі на ўсе пытанні: "Перад прыездам пра вашу краіну ведалі няшмат. Усе веды — хакейнага кшталту. Мы былі вельмі засмучаны паражэннем нашай зборнай на Алімпіядзе-2002, калі ваш Уладзімір Копаць прымусіў плакаць усю Швецыю... ". А вось беларускае піва шведам спадабалася: *"У кожнай краіне, дзе выступаем, просім арганізатараў падрыхтаваць некалькі гатункаў бурштынавага напою. Вашае піва смачнае",* — сказаў гітарыст гурта, павольна пацягваючы піва.

Выступленне шведскага гурта — сапраўднае шоу ад папулярнага гурта "Топлес" Анастасіі Касянковай у кампаніі Карыяны і Улады з "Прыпеўкамі Бабак Ёжак". Раней удзельніцы "Топлес" заўсёды выходзілі на сцэну разам. Як стала вядома пазней, гурт распаўся. А.Касянкова працягвае працаваць з прадзюсерам і кампазітарам Максімам Алейнікавым, тады як дзве астатнія салісткі пакінулі калектыў.

Прычыны распаду Анастасія не стала тлумачыць. *"Гэта вельмі доўгая гісторыя. Шыра кажучы, я не хачу пра гэта гаварыць. Я засталася з Максам Алейнікавым, бо лічу гэта правільным. Цяпер мы плануем набіраць новы склад і працаваць далей як гурт "Топлес" — права на назву і песні належыць Максу",* — паведаміла спявачка.

Верагодна, рашэнне пра распад калектыву было прынята зусім нядаўна, бо яшчэ 28 жніўня ў Інтэрнеце пачаў працаваць неафіцыйны сайт гурта, у навінах якога анансаваўся ўдзел "Топлес" у "Песні года Беларусі".

Людміла ВАСІЛЕВІЧ.

Неизвестные продолжают настойчиво угрожать белорусской певице Улялюм

Очередное письмо пришло на домашний адрес девушки. Текст тот же: "Девушка, с смешным иностранным названиям Улялюм!!! Если хочешь ЖИТЬ, уходи со сцены и Белорусской эстрады (будет СЕРЬЁЗНАЯ ОПАСНОСТЬ на твоём пути.)" (авторские орфография и пунктуация сохранены).

После получения первого письма Улялюм обратилась в милицию с заявлением. На днях певица нанесла второй визит в Ленинское РУВД г.Минска. *"Все, что мы можем сделать, это вызвать подозреваемых, на которых указала девушка, и "пальцем пригрозить",* — комментирует ситуацию заместитель начальника Ленинского РУВД.

Подозреваемых "авторов" (бывший молодой человек Улялюм или его новая девушка, которая ранее угрожала певице по телефону) вызовут в ближайшие 15 дней, сообщает пресс-служба певицы.

www.tut.by

«Топлес» і паасобку

2 верасня ў рамках праекта "Музычныя вечары ў Мірскім замку" на адкрытай пляцоўцы выступіў саліст "Modern Talking" Томас Андэрс са старымі хітамі і кампазіцыямі з новага альбома. Выступленне сусветнай зоркі выклікала вялікі ажыятаж: да канца канцэрта большасць гледачоў не здолелі ўсядзець на месцы і пачалі танцаваць.

Фінальным акордам "Музычных вечароў" быў канцэрт "Песні з мультфільмаў" з удзелам айчынных зорак. Тое, што адбывалася на сцэне, было падобна на маскарад: беларускія артысты добра папрацавалі, каб адпавядаць сваім знешнім выглядам казачнаму герою, якога яны прадстаўлялі.

Нечаканасцю быў выхад на сцэну адной з салістак папулярнага гурта "Топлес" Анастасіі Касянковай у кампаніі Карыяны і Улады з "Прыпеўкамі Бабак Ёжак". Раней удзельніцы "Топлес" заўсёды выходзілі на сцэну разам. Як стала вядома пазней, гурт распаўся. А.Касянкова працягвае працаваць з прадзюсерам і кампазітарам Максімам Алейнікавым, тады як дзве астатнія салісткі пакінулі калектыў.

Прычыны распаду Анастасія не стала тлумачыць. *"Гэта вельмі доўгая гісторыя. Шыра кажучы, я не хачу пра гэта гаварыць. Я засталася з Максам Алейнікавым, бо лічу гэта правільным. Цяпер мы плануем набіраць новы склад і працаваць далей як гурт "Топлес" — права на назву і песні належыць Максу",* — паведаміла спявачка.

Верагодна, рашэнне пра распад калектыву было прынята зусім нядаўна, бо яшчэ 28 жніўня ў Інтэрнеце пачаў працаваць неафіцыйны сайт гурта, у навінах якога анансаваўся ўдзел "Топлес" у "Песні года Беларусі".

Людміла ВАСІЛЕВІЧ.

ЭКСКЛЮЗИВ

Виктор КУЛЬБАЧЕНКО:

«Трагедии было не избежать...»

По возвращении из Пакистана известный белорусский альпинист Виктор КУЛЬБАЧЕНКО, чудом спасшийся во время недавней трагической экспедиции по восхождению на гору Чогори ("К-2"), согласился побеседовать с корреспондентом "Народной воли".

Статистика — вещь не только сухая, но иногда и ужасная: при восхождении на "К-2" погибает каждый четвертый альпинист. Нынешняя российская экспедиция, в составе которой был и Виктор Кульбаченко, не стала исключением — четверо альпинистов погибли...

— Виктор, сегодня Вы уже можете сказать, что стало главной причиной трагедии?

— Наверное, все-таки повышенная лавинная опасность. Шел мелкий снег, мы шесть дней сидели на высоте 6500 метров, за это время снег накопился, был уже выше колена, и на крутых склонах сложилась напряженность. Да, возможно, и надо было дня два подождать, но "К-2" — это такая непредсказуемая гора! Например, 13-го мы пошли, и погода была нормальная. 14-го, когда начали спуск с 7400, — пурга. Пурга четыре дня подряд. То есть в той ситуации нам надо было или идти на гору (что мы и сделали), или не идти вообще. Не знаю... Может быть, и правильнее было бы никуда не идти.

— Решение подниматься на вершину принял коллектив?

— Понимаете, есть, конечно, руководитель группы и руководитель экспедиции. Ко мне, к Петру Кузнецову где-то прислушивались. Я, например, предлагал выйти в десять вечера. Но брался мороз, ребята забеспокоились — обморозимся. В итоге вышли в два часа ночи. Может быть, если бы вышли тогда в десять... Не знаю, это все субъективно. Никто ведь не знал, что будет, наперед. Но мы пошли тогда, когда пошли — и трагедии было не избежать. А уже дальше идут "мелочи" — где-то веревкой не связались, где-то что-то еще...

— Многие информационные агентства сообщали, что Вам повезло, потому что Вы шли в группе первым.

— Глупости! Первых лавина "срезала" — Кузнецова и Кувакина. Затем был мой черед и Александра Гапонова. И вообще из шестерых первых, которых накрыла лавина, четверо погибли. Это была "доска", доскообразная лавина, когда срывается целый пласт склона. И преимущества в такой ситуации нет ни у первых, ни у последних — "стена" накрывает всех.

— Что помогло выжить Вам?

— Не знаю, есть, наверное, какой-то ангел-хранитель. Когда нас засыпало, я просто лежал, чувствовал, как тяжесть снега надо мной растет и растет, и тихо думал о том, что если еще чуть-чуть — встать я уже не смогу. Но, слава Богу, смог выбраться самостоятельно.

— Обошлось без травм?

— Да, если не считать того, что мне где-то на высоте 6000 метров очень сильно камнем пробило левую кисть. Вот, думаю, везет этой руке — на ней и так, после прошлых экспедиций практически два пальца осталось, а тут новое "счастье". Все, думаю, перелом. Кровь свищет, кое-как перетянул тонкой руковицей. Но обращать на это внимание было в тот момент смерти подобно — там постоянно шли камнепады, и останавливаться было нельзя.

— Виктор, сколько Вы не дошли до вершины?

— Метров триста. Лавина оторвалась где-то на уровне 8350, вершина горы — 8611 метров. Самое обидное, что все самое сложное уже было пройдено. На 8200 благополучно прошли "бутылочное горлышко", честно скажу, лавину никто не ожидал. Но она пришла без приглашения...

— Чем занимаетесь сейчас?

— Прихожу в себя, на это нужно время. В весе потерял около 10 килограммов — это даже больше, чем тогда, когда поднимался на Эверест. Скоро будет сорок дней по ребятам, затем собираюсь написать воспоминания... И надо продолжать работать.

— "К-2" для Вас так и осталась непокоренной...

— Я понял, намек насчет того, соберусь ли я туда снова? Дело в том, что для меня Чогори — покоренная. Повторюсь, самое главное, самое тяжелое мы прошли. Оставалось-то всего каких-то триста метров... Конечно, это прекрасно — взойти на пик вершины, но, по большому счету, 8300 — это тоже неплохо. Я слишком много хлебнул на этой горе, это все надо пережить. В альпинизме я достиг практически всего, чего хотел, — три экспедиции, три высочайшие вершины мира. Во время двух моих экспедиций семь человек погибло. Может быть, это какие-то своеобразные "звонки" мне сверху, может, что-то еще... Все надо переосмыслить. Во всяком случае, завтра и послезавтра в горы я не пойду. А на "К-2" теперь, думаю, экспедиция будет нескоро.

— Виктор, в Москву-то Вас как занесло?

— Переехали с семьей, занимаюсь там промышленным альпинизмом. Работаю на высотках — мою стекла, делаю швы... Все, что выше пятидесяти метров, — это мое. Эдакие маленькие-маленькие горы...

Беседовал Алесь СИВЫЙ.

ШАШКІ

Руская і бразільская версіі

Перад вамі новы твор гросмайстра Леаніда ВІТОШКІНА (Гомель) — камбінацыйная мініяцюра ў рускіх шашках:

Белыя: a7, b2, b4, e3, e7 (5).

Чорныя: a3, b6, c5, d6, f8, g5 (6).

Выйгрыш.

Таго, хто дашле на яе самы аптымальны адказ, чакае сюрпрыз — кніга на шашачную тэму.

Легальнасць міні-праблемы Л. Вітошкіна даказваецца: 1. дамка f8-g7 f4:d2 2. c:e3 h6:f8 і ўзнікла зыходная пазіцыя. У ёй ажыццяўляецца галоўная задумка эцюда Я. Гордзіна:

Белыя: b6, c3, g3 (3). **Чорныя:** d6, e3, f6 (3). 1. ba7 fg5A 2. cd4 3. gf4 4. ab8 cd4B 5.

b:d2x. B4...cb4 5. b:a5x. Калі ж 1 ... dc5(A), тады 2. gf4 3. ab8x.

Пазнаёмцеся і з бразільскай версіяй гэтай ідэі, у якой, як і ў стоклетках, біць большасць фігур абавязкова:

Белыя: a7, b4, f6, g3, g5, g7 (6). **Чорныя:** a3, b8, d2, d4, d6, d8, e3 (7). Перамога белых.

Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Тэрмін для адказаў — традыцыйныя два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Супаставім рашэнні

Давайце гэта зробім на наступных заданнях.

"Пас "пяткай" і "Эфектная мініяцюра". Класіфікацыйны конкурс-20:

№ 10 (М. Іржаўскі). 1. cb2 2. ef2 3. ab6 4. b:f6 5. h:g1x;

№ 11 (У. Матус). 1. ed4 2. a:a7 3. ab8 4. b:b2 5. gf4 6. h:b8x. "Гол" закручаным ударам!

"Новыя творы" (Л. Вітошкін): 3 ... hg3AB 4. cd6x. A3...cd2 4. cd6x. B3...cb2 4. cd6 5.

f:c1 6. ce3x. Да мэты вядзе і 2. cd6x. Убачылі В. Жук і А. Янчук.

"З партый першынстваў" (В.Аніська-Я.Кандрачэнка): 8. a:g5 альбо d:g5x. Так што эцюда ў партыі не атрымалася. Звярнуў увагу Л. Вітошкін.

Першымі правільныя рашэнні даслалі: Валерый Жук і Аляксандр Янчук (Камянец), Іван Працук (Паставы), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Анатоль Чумакоў (Светлагорск), Альберт Ліцьвінаў (Мінск), Леанід Жыхар (г.п. Крывічы Мядзельскага раёна), Мікалай Клязовіч (Жодзіна), Васіль Бялоў (Магілёў).

Аляксандр Сапегін (п/а Усполле Мсціслаўская р-на), С.Алымаў і Павел Каролік з Гомеля, пінчук Мікалай Андрушчанкаў, мінчане Васіль Грабенка, Людміла Рыжова, Фёдар Хадачынскі і Віктар Шульга прыслалі свае водгукі і заўвагі, якія ўжо ўлічваюцца. А вось што піша Альберт Нікіфараў са сталіцы: "Па выніках конкурсу прэміраваны шашачнай літаратурай і выказваю вам падзяку. Вельмі рады і таму, што выканаў норму першага спартыўнага разраду па шашках". Другі мінчанін Віталь Варушыла дадае: "Пры рашэнні кампазіцый адчуваю задавальненне, даволі складаныя заданні, але ў іх заўсёды ёсць знаходкі, хоць, бывае, і з дужа вычварнай пачатковай расстаноўкай фігур". Дарэчы, В. Варушыла — не толькі першакласны рашальнік, але і майстар ФМЖД па стоклетачных шашках, ужо і сам вядзе раздзел шашак у газеце "Спортпанорама", прычым своеасабліва і на добрым прафесійным узроўні. 25 жніўня мы паведамлялі, што Віталь выйграў першы прыз у прэстыжным міжнародным турніры, які ладзіўся ў польскім горадзе Журомін.

«Етвызь-2006»

Дзякуючы намесніку дырэктара аднаго з драгічынскіх прафтэхвучылішчаў, міжнароднаму майстру Васілю НАГУРНАМУ адбыўся чарговы турнір "Етвызь-2006". На гэты раз у ім перамаглі мінскія майстры **Вячаслаў Палянскі** і **Юрый Файнберг**, трэцяе прызавое месца заваяваў мясцовы кандыдат у майстры спорту **Зміцер Гарматны**. Чэмпіён Беларусі Яўген Кандрачэнка (Гомель) набраў усяго 50% ачкоў.

— Цяжка быць чэмпіёнам, бо супраць яго ўсе гуляюць на ўсю моц, — растлумачыў свой вынік Я.Кандрачэнка. — Да таго ж я рупліва займаўся выдавецкім праектам, зразумела, на шашачную тэму.

У сваім архіве мы знайшлі эпізод з партыі пераможцаў, які варта ўзяць на заметку і цяперашнім ігракам:

Белыя (В. Палянскі): a3, c1, c3, d2, d4, e1, e3, f4, g1, h2 (10). **Чорныя:** (Ю. Файнберг): b6, b8, c5, d8, e7, f8, g7, h4, h6, h8 (10). 1 ... hg3 2. fg5 (2. fe5 ef6 3. h:f4 ba5 4. d:b6 f:b2 5.

ab4 a:c3 6. c:a3 bc7 7. d:b4 c:c3x) 3. e:g5 4. h:f4 ef6 5. g:e7 e:g5x. Зусім невідавочны план, так гуляюць толькі сапраўдныя знаўцы свайго рамяства.

Прапагандыст гульні

Пастаянны карэспандэнт нашай рубрыкі "Шашкі" Вільям АСТРЫНСКІ — чэмпіён Беларусі 1951 года па шашках-64. Ён з'яўляецца самым актыўным прапагандыстам старадаўняй гульні. Ужо шмат гадоў пад яго кіраўніцтвам праходзяць турніры, матчы паміж наведвальнікамі мінскага парку культуры і адпачынку імя Чэлюскінцаў. Каб падняць аўтарытэт гэтых спаборніцтваў, маэстра сам удзельнічае ў іх і паказвае прыклады прыгожай гульні, якія многіх прыцягваюць да шашак на ўсё жыццё. Вось два з іх:

1.Белыя: a3, b4, дамка f6 (3). **Чорныя:** b6, f2 (2). Адпачываючыя парку ацэньвалі барацьбу бакоў роўнай. Аднак раптоўна перамога белых надышла ў выніку тонкага 1. fc3!, і сапернік В. Астрынскага здаўся.

2.Белыя (кандыдат у майстры спорту Ігар Ліпай): a5, d4, e3, g1 (4). **Чорныя:** (В. Астрынскі): a7, d6, f2, f6 (4). 1. ab6!=. А 1. de5? прайграваў эцюдна: 1 ... d:d2 2. g:c1 fe5 3. cb2 ed4 4. ba3 de3 5. ab4 ef2 6. bc5 fe1! 7. cd6 eh4 8. dc7 hg3x.

Мікалай ГРУШЭЎСКІ, майстар спорту.

УВАГА!

Па просьбах пасажыраў...

У расклад руху аўтобусаў з Мінска па міжгародніх і прыгарадных маршрутах унесены шэраг змяненняў.

Па просьбе пасажыраў з 6 верасня арганізаваны рух аўтобусаў вялікай умяшчальнасці ва ўсе дні тыдня па маршрутах: **"Мінск—к.п.Нарач"** (7.40, ад к.п. Нарач у 13.30); "Мінск—Лельчыцы" (13.30, з Лельчыц у 12.30); "Мінск—Хоцімск" (8.50, з Хоцімска ў 7.35).

Па выхадных днях будуць хадзіць аўтобусы вялікай умяшчальнасці па маршрутах: **"Мінск—Браслаў"** (8.10, з Браслава ў 17.20); **"Мінск—Жыткавічы"** (7.40, з Жыткавіч у 16.10); **"Мінск—Чачэрск"** (8.10, з Чачэрска ў 16.45); **"Мінск—Клімавічы"** (10.30, з Клімавіч у 8.10).

З 9 верасня ў сувязі з нязначным пасажырапатокам прыпыняецца рух аўтобусаў па маршрутах: **"Мінск—Бабруйск"** (9.20, з Бабруйска ў 11.50) па суботах, нядзелях; **"Мінск—Салігорск"** (8.00, з Салігорска ў 12.00) ва ўсе дні тыдня.

З 1 верасня прыпынены рух аўтобусаў па маршруце "Мінск—Светлагорск" (13.10).

1, 8, 15, 22 і 29 верасня 2006 года рэйс па маршруце "Мінск—Гродна" (20.00) па пятніцах выконвацца не будзе па тэхнічных прычынах.

Таксама з 1 верасня адкрыты рух аўтобусаў па маршруце **"Мінск—Градзянка"** (8.40, 14.40) ва ўсе дні тыдня і па экспрэсным прыгарадным маршруце **"Мінск—Радашковічы"** праз пас. Лясное, Юзуфава. Будуць ажыццяўляцца рэйсы адпраўленнем з Мінска ад аўтавакзала "Маскоўскі" ў 7.45, 11.37, 15.30 (з Радашковічаў у 9.45, 13.35, 17.04) па ўсіх днях тыдня.

З 6 верасня па маршруце "Мінск—Гомель" рэйс адпраўленнем з Мінска ад аўтавакзала "Усходні" ў 7.20 (з Гомеля ў 15.00), уведзены тарыфны пункт "Бабруйск (аўтавакзал)" і тарыфны пункт "Новы Востраў" (на 184 км ад Мінска).

Марына НОСАВА.

МЕЛЬПАМЕНА

Сезон адкрыецца «Паўлінкай»

2 верасня пасля летняга адпачынку адбыўся сход трупы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Генеральны дырэктар Мікалай Кірычэнка і мастацкі кіраўнік Валерый Раеўскі падвялі разам з артыстамі вынікі апошняга тэатральнага сезона і абмеркавалі планы на будучы. Новы сезон тэатр адкрые сёння, 8 верасня, па традыцыі купалавай "Паўлінкай".

Свой 86-ы сезон Купалаўскі тэатр закрыў 28 ліпеня прэм'ерай спектакля "Маэстра" сучаснага ўкраінскага драматурга Марыі Ладо. У гэты сезон на Вялікай сцэне тэатра былі таксама пастаўлены тры адметныя спектаклі: містэрыя "Сымон-музыка" Якуба Коласа ў рэжысуры Мікалая Пінігіна (прэм'ера 19 лістапада 2005 года), казка "Снежная каралева" Яўгена Шварца, рэжысёр Міхаіл Лашыцкі (прэм'ера 19 лютага 2006 года) і рэквіем "Вечар" Аляксея Дударава, рэжысёр Валерый Раеўскі (прэм'ера 19 мая 2006 года).

На Малой сцэне Уладзімір Савіцкі паставіў спектакль па знакамітай аповесці Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" (прэм'ера спектакля адбылася 30 верасня 2005 года), а шведскі рэжысёр Аляксандр Нордштрэм стварыў монаспектакль "Востраў Сахалін" паводле аднайменнага твора Антона Чэхава.

Да канца бягучага года Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы рыхтуецца прадставіць сваім гледачам спектакль "Макбет" В.Шэкспіра ў рэжысуры вядомага літоўскага майстра Альгірдаса Латэнаса, а таксама шэраг іншых цікавых пастановак.

БелаПАН.

СЕНСАЦИЯ

Мумия возрастом 2500 лет

Эта находка считается сенсационной и возбуждает воображение исследователей, подобно знаменитому Этци. Международный коллектив археологов под руководством Германского археологического института (ГАИ, DAI) обнаружил в Монголии мумифицировавшееся под воздействием холода тело скифа, которому около 2500 лет. На высоте 2600 м археологи наткнулись на неповрежденный курган с искусно выполненными предметами могильного инвентаря, сообщил в Берлине президент ГАИ Герман Парцингер.

Мумия воина, бывшего, по всей вероятности, состоятельным человеком, сохранилась необычайно хорошо вплоть до лица. Не повреждена даже войлочная шапка, различимы и татуировки. Здесь еще сохранились даже остатки мяса и посуда 2500-летней давности. Мумия, которая законсервировалась на льду, одета в шубу из меха сурка и валенки. Кроме того, под балками из лиственницы лежали также кинжал, лук и колчан со стрелами.

"Фантастическая находка", — не скрывал своего восторга Г.Парцингер, представляя ее в Министерстве иностранных дел.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 07.09.2006 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №